Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№161 (28525)
23 ЖНІЎНЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



**Аб набалелым у ЖКГ**



**Каб азёры краю не сталі атрутнымі**



**Запрашаю цябе... паблукаць па кукурузе**
СТАР. 4

# Былі ў яго мядзведзі...



Дзякуючы Івану БУДЗІЧУ — жыхару Лепеля, — пра беларускіх мядзведзяў ведаюць у Англіі, Германіі, Даніі, Малдове, Расіі, Эстоніі. У гэтых і іншых краінах знаходзяцца разьбяныя скульптуры самабытнага майстра. Іван Мікалаевіч Будзіч — адзіны з нямногіх рэзчыкаў па дрэве, які сваё творчае жыццё прысвяціў «касалапаму чырванакніжніку». Мядзведзь у яго атрымліваецца ў розных ролях, напрыклад паляўнічым, урачом, музыкантам, вайскоўцам... Добрым, пяшчотным, усмешлівым, цікаўным, бывае і сумным. І ніводны вобраз драпежніка не паўтарае папярэдніх.

Сёлета на фестывалі «Славянскі базар» на пленэры-конкурсе разьбяроў Іван Будзіч за свайго мядзведзя атрымаў першае месца.

У майстэрні мастака цяпер стаяць яго новыя творы на мядзведжую тэму: хутка тры мішкі ўпрыгожаць тэрыторыю Лепельскага ваеннага санаторыя.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАРЫНІЧ, першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Добры ўраджай, які будзе сабраны сёлета, знізіць сабекошт сельгаспрадукцыі, затраты сельскагаспадарчых арганізацый, а таксама павысіць іх даходы. Мы ў новых умовах атрымалі ўрокі аператыўнага кіравання самім працэсам, арганізацыі рамонту, пастаўкі запасных частак. Сёлета як ніколі зладжана працаваў прамысловы і сельскагаспадарчы комплексы. Мы адчулі сябе адным цэлым».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9303 | ▼ |
| Еўра | 2,2749 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0758 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ Здымнае жыллё

# У фармаце калектыўнай арэнды

На другасным рынку жылля сталіцы менавіта ў другой палове жніўня пачаўся так званы студэнцкі бум

**Новы навучальны год ужо зусім блізка, таму мы вырашылі даведацца, як гэта паўплывала на рынак доўгатэрміновай арэнды жылля, і на што цяпер можна разлічваць кватарантам і ўласнікам свабодных метраў.**

## Старшакурснікі выбіраюць перыферыю

— Штогод, у апошнія месяцы лета, вялікая частка запытаў на арэнду кватэры паступае ад студэнтаў і іх бацькоў. Не стаў выключэннем і гэты год, — расказвае **начальнік аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Юлія ІВАНОВА**. — Студэнты старшых курсаў здымаюць кватэры самастойна, складаючы дагавор на саміх сябе, а для студэнтаў пачатковых курсаў гэта, як правіла, робяць іх бацькі.

Для студэнтаў першых курсаў пры пошуку важна, каб кватэра была як мага бліжэй да навучальнай установы. І іх можна зразумець — бо і бацькі, і самі навапечаныя студэнты яшчэ слаба арыентуюцца ў сталіцы. Але тыя, хто ўжо не першы год у Мінску, здагадваюцца, што пры наяўнасці ў крокавай даступнасці прыпынку грамадскага транспарту, не кажучы ўжо пра метро, у любую кропку сталіцы можна дабрацца ў самыя кароткія тэрміны без істотных цяжкасцей. Менавіта таму старшакурснікі ў першую чаргу арыентуюцца на суадносіны цаны і спажывецкіх якасцяў кватэры, а не на яе месцазнаходжанне адносна навучальнага корпуса. Але ў любым выпадку цікавыя прапановы кватэр па суадносінах «цана — якасць» з мікрараёна Шабаны іх не цікавяць — для студэнтаў гэта ўжо іншы горад.

У моладзі ўсё большай папулярнасцю карыстаецца фармат «калектыўнай арэнды», калі адна кватэра здымаецца для пражывання некалькіх чалавек. Гэта можа быць аднапакаёвая для двух ці двухпакаёвая для трох ці чатырох чалавек. Такая тэндэнцыя на сталічным рынку назіралася ўжо летась, але яна хутчэй мела ўстойлівы характар, калі кампаньёны шукалі кватэру самастойна.

СТАР. 4

■ АПК

# БЛАКІТНАЕ «ЗОЛАТА»

Як развіваецца льнаводчая галіна на Міншчыне?

**У Беларусі заўсёды было асаблівае і трапяткое стаўленне да вырошчвання лёну. Яго здаўна называлі блакітным «золатам». Гэтая сельскагаспадарчая культура, калі правільна яе апрацоўваць, прытрымліваццa тэхналогій, — рэнтабельная. У лепшыя часы такую рэнтабельнасць давала нафта. Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка пры наведванні рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Вусце» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Аршанскім раёне. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ліквідаваць недахопы ў ільнаводчай галіне.**



Фота БЕЛТА.

«Лён любіць паклон», — так кажуць людзі старэйшага пакалення. Сапраўды, усе аперацыі амаль што да 80-х гадоў мінулага стагоддзя ажыццяўляліся ўручную. І трэба было нізка нагнуцца, каб сарваць кожную сцяблінку. Цяпер гэтая прыказка страціла сваю актуальнасць. Усе працэсы ў ільнаводчай галіне аўтаматызаваныя. Карэспандэнт «Звязды» наведала Слуцкі льнозавод, пабывала на полі, дзе вырошчваецца гэтая культура, і на гэтым прыкладзе адсачыла перспектыву развіцця льняной галіны Мінскай вобласці.

СТАР. 2

# РОСТ ЁСЦЬ. ЯК ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ДЫНАМІКУ?

## Прэзідэнт правёў нараду з кіраўніцтвам урада

**Аляксандр Лукашэнка ўжо правёў нарады з палітычным — Адміністрацыя Прэзідэнта — і сілавым штабамі краіны. Учора настала пара эканамічнага штаба, прадстаўленага ўрадам. Пытанні ўзнімаліся самыя розныя — ад традыцыйнага «трыа» сацыялкі (цэны — занятасць — зарплаты) і ўборкі ўраджаю да выканання спецыяльных даручэнняў кіраўніка краіны па развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі.**

### Аператыўнасць і тактыка

Як ужо планавалася раней, падобныя мерапрыемствы, своеасаблівыя рабочыя сустрэчы кіраўніка краіны са штабамі, адказнымі за розныя кірункі бяспекі краіны, павінны праходзіць штоквартальна.

— Хачу папярэдзіць і прэм'ер-міністра, і ўсіх прысутных, што гэта не мае нічога агульнага са справаздачай урада перад Прэзідэнтам, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Справаздача запланавана і будзе ў свой час. Такія нарады будуць насіць, можна сказаць, амаль аператыўны характар. У сувязі з гэтым і пытанні на нарадзе будуць разглядацца тактычнага характару.

Даволі часта ў розных ведамствах узнікаюць пытанні, сітуацыі, якія хацелася б абмеркаваць з кіраўніком краіны. Але, безумоўна, гэта не заўсёды рэальна. А вось такога кшталту аператыўныя сустрэчы якраз і прызваны вырашыць гэтую праблему.

— Я на падобнай нарадзе гатовы адказваць на пастаўленыя пытанні і прымаць па іх пры неабходнасці рашэнні, — заявіў Прэзідэнт. — Сёння мы абмяркуем актуальныя пытанні, што ўваходзяць у кампетэнцыю кіраўніка ўрада.

### Каб цэны не «танцавалі»

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што развіццё эканомікі прадвызначае стан сацыяльна-палітычнай абстаноўкі, матэрыяльнага дабрабыту людзей:

— Таму ад адказных службовых асоб урада я хацеў бы сёння пачуць, па-першае — адным радком, — як спрацавалі галіны эканомікі ў першым паўгоддзі і якія рэальныя магчымасці выканання гадавых прагнозаў. Невялікі — каля працэнта — рост нібыта ёсць, але наколькі стабільны гэты рост і якая будзе ў гэтым плане дынаміка?

Прэзідэнт пацікавіўся, як выконваюцца яго даручэнні па кантролі за цэнамі ў краіне.

— З аднаго боку, інфляцыя знаходзіцца ў рамках, нашмат ніжэйшых за прагноз, — і гэта добра. Аднак з іншага боку, людзі скардзяцца, што цэны адкрыта «танцуюць» па асобных пазіцыях. Напрыклад, па леках, нават па асобных хлебабулачных вырабах. Няхай нязначна, але такія ваганні ў наяўнасці.

Якая сітуацыя на рынку працы? Прэзідэнт нагадаў, што яшчэ ў мінулым годзе дамаўляліся: на кожнае скарочанае працоўнае месца павінна быць створана новае, высокапрадукцыйнае.

— Але ў нас па-ранейшаму прадпрыемствы працягваюць больш звальняць, чым прымаць на працу, — звярнуў увагу ён. — Прынамсі, па той інфармацыі, якой я валодаю. У чым справа? Яшчэ больш нявызначаная сітуацыя з прадпрыемствамі, якія закрываюцца. Куды ідуць людзі? На паперы новыя працоўныя месцы нібыта і ствараюцца, а на справе — суцэльнае ашуканства. Калі гэта не так, хацелася б пачуць адказ на гэтае пытанне. Як мяне інфармуюць, лік занятых у эканоміцы скарачаецца.

Як заўсёды, вялікае значэнне надаецца заработнай плаце. Прэзідэнт спытаў, як урад адрэагаваў на яго даручэнне звярнуць асаблівую ўвагу на катэгорыі работнікаў, што атрымліваюць зарплату «па ніжняй мяжы». Гэта якраз тыя людзі, ад якіх напрамую залежыць дабрабыт дзяржавы, і занятыя яны ў сельскай гаспадарцы, адукацыі, ахове здароўя, культуры, сацыяльным забеспячэнні.

### Уборка ўраджаю — не гераізм

Зараз жа найважнейшы клопат — харчовая бяспека дзяржавы.

— Я ўважліва адсочваю тое, пра што пішуць асобныя сродкі масавай інфармацыі, — прызнаўся кіраўнік краіны. — Памылка журналістаў у тым, што яны пішуць пра нейкі гераізм на ўборцы ўраджаю, у тым ліку Прэзідэнта. Ніякага гераізму на ўборцы няма. Гэта спрошчаны падыход да таго, што раблю я і ўсе тысячы людзей, якія сёння занятыя ў тым ліку і ўборкай. Гаворка ідзе выключна пра харчовую бяспеку нашай краіны.

Па словах кіраўніка краіны, калі людзі будуць накормленыя, тады і ў краіне будзе мір і парадак.

### Найвялікшае дасягненне

Што да малочнатаварных комплексаў, Прэзідэнт пацікавіўся, як ідзе іх будаўніцтва. Да гэтай тэмы ён звяртаўся зусім нядаўна ў самым практычным плане трошкі больш за тыдзень таму, падчас рабочай паездкі на Брэстчыну.

— Гэта ніякія не фермы, гэта комплексы. Калі мы мелі праект мадэрнізацыі і будаўніцтва новых фермаў, іх было колькі? — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка.

— Тысяча дзвесце восем, — паведамілі яму. — Плюс будаўніцтва трохсот дзвюх.

— Я ўжо казаў, што ў сувязі з некаторымі праблемамі на фінансавым рынку, я не напружваў па гэтых тэмах, маю на ўвазе завяршэнне мадэрнізацыі і будаўніцтва новых малочнатаварных комплексаў. Не напружваў — ні спецыялістаў, ні фінансавую сістэму. Таму што гэта патрабуе пэўных сродкаў. Сёння настаў час заняцца гэтымі праблемамі. Гэта найвялікшае наша дасягненне, што мы ў свой час схапіліся за гэтыя малочнатаварныя комплексы.

— Малако сёння рэнтабельнае, і ў асноўным на малочнатаварных комплексах, якія мадэрнізаваныя і адбудаваныя, — найвышэйшая якасць малочнай сыравіны, з якой мы вырабляем шыкоўную прадукцыю, што сёння карыстаецца попытам на ўсім свеце. Настаў час завяршыць гэты працэс, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба да канца 2018 года скончыць будаўніцтва і мадэрнізацыю старых малочнатаварных комплексаў там, дзе мы іх запланавалі, і забяспечыць іх якаснымі кармамі.

### Суперкамбайн ад «Гомсельмаша»

Што да прамысловага комплексу, то Прэзідэнт нагадаў пра заданне, пастаўленае ім асабіста: да ўборачнай 2018 года абнавіць мадэль камбайна «Палессе».

— Увогуле, нам трэба спыніцца на нейкіх мадэлях, якія будуць запатрабаваныя на рынку. Той камбайн, які мы апрабавалі нядаўна ў Магілёўскай і Віцебскай абласцях, — нядрэнны. Жне чыста, нічым не саступае імпартным аналагам, і добра, што цяперашнія канструктары «Гомсельмаша» на гэтым не спыняюцца. Яны заяўляюць пра тое, што ёсць кірункі, па якіх яшчэ можна палепшыць гэты камбайн.

Асобнае даручэнне — распрацаваць айчынны рухавік для нашых камбайнаў. А далей — і найлепшы камбайн у свеце!

### Дзяржпадтрымка без варыянтаў

Наступны пункт для абмеркавання на нарадзе з урадам — справы ў будаўнічай сферы.

— Жыллё, іншыя аб'екты... Што робіцца для зніжэння іх сабекошту? Мяне гэта сфера вельмі хвалюе. Калі нехта ва ўрадзе хоча згарнуць будаўніцтва жылля, я ім раю не марудзячы перайсці ў адна- і двухпакаёвыя кватэры разам са сваімі сем'ямі або зняць кватэру па найме і жыць з гаспадарамі, — заявіў Прэзідэнт.

Спытаў кіраўнік краіны і пра фінансавую стабільнасць у краіне: як яна забяспечваецца і якія меры прыняты для ўмацавання нацыянальнай валюты. Яшчэ адна тэма — экспарт тавараў і паслуг.

— Калі ў цэлым дзякуючы цэнавому фактару адбыўся рост экспартнай выручкі і сітуацыя палепшылася — гэта нядрэнна, але пакуль сур'ёзных зрухаў да дыверсіфікацыі, засваення новых рынкаў тавараў і паслуг няма. Трэба гэтыя пытанні абмеркаваць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

— За сямі месяцаў (бягучага года. — **Аўт.**) у нас абазначыўся эканамічны рост. Ён пацвярджае тыя значэнні, якія былі ў нас, пачынаючы з выніказ першага квартала. За сем месяцаў у нас темп валавога ўнутранага прадукту склаў 101,1%. І гэта нягледзячы на тое, што ў сілу аб'ектыўных прыродна-кліматычных умоў у нас тэрміны ўборкі ўраджаю зрушыліся на два-тры тыдні ў адносінах да мінулага года.

Кіраўнік урада канстатаваў: сёння важна не згубіць бягучую макраэканамічную ўстойлівасць, якую мае наша эканоміка.

— У нас устойлівая тэндэнцыя на зніжэнне інфляцыі. Ёсць перспектывы да таго, што па выніках — снежань да снежня — у нас інфляцыя можа не перавысіць 7%, што цягне за сабой іншыя, вельмі залежныя ад гэтага паказчыкі, параметры. Напрыклад, працэнтныя стаўкі па крэдытах.

# БЛАКІТНАЕ «ЗОЛАТА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Слуцкі льнозавод — самы буйны сярод аналагічных прадпрыемстваў цэнтральнага рэгіёна. Больш як два гады таму тут завяршылася рэканструкцыя, устаноўлена новая бельгійская лінія «Depoortere» па выпуску льновалакна. Яна дазваляе атрымліваць яго дзве тоны за гадзіну, гадавая патрэба льнотрасты для поўнай загрузкі — каля 10 тыс. тон. З уводам у дзеянне канвеера вытворчая магутнасць завода па перапрацоўцы сыравіны павялічылася больш як у 2,5 раза. Усё гэта дало магчымасць прадпрыемству выйсці на прыбытковую работу. Для параўнання: у 2013 годзе страты былі на ўзроўні 200 тыс. рублёў, а ў 2016-м спрацавалі з прыбыткам у 71 тыс. рублёў, рэнтабельнасць — 1,5%. Прычым сабекошт прадукцыі за сем месяцаў склаў 3350 рублёў пры 3530 за адпаведны мінулагодні перыяд.

— Церабленне лёну мы пачалі 4 ліпеня і закончылі яго ва ўсёй сыравіннай зоне. Цяпер галоўнае — убраць участкі, прызначаныя для насення. Такіх засталося менш за 200 гектараў. Ураджай прывозім у цэх проста з поля. Раней яго складавалі пад навесамі. Новая лінія дазваляе атрымліваць безадходную прадукцыю: асобна насенне, валакно, трасту.

Перш за ўсё завод выконвае дзяржзаказ — пасля перапрацоўкі прадукцыя адпраўляецца на Аршанскі льнокамбінат. Пасля гэтага прадпрыемства можа атрымаць ліцэнзію на пастаўку валакна на экспарт. Яго з задавальненнем набываюць Кітай, Расія, краіны Еўрасаюза. Сёлета, лічыць кіраўніцтва, таксама не будзе адбою ад кліентаў, на чым можна нядрэнна зарабіць.


Фота БЕЛТА.

На адным з палёў урочышча Новая Ніва ў самым разгары работы.

— Сезон уборкі лёну — нагода адчувальна папоўніць сямейны бюджэт. Тым больш, што ўраджай выдаўся нядрэнны, — кажа **механізатар Аляксандр ЛІПЕЕЎ**. — Зімой, вядома, заробкі меншыя: займаемся ў асноўным рамонтам тэхнікі. Кормяць нас добра, гарачыя абеды дастаўляюць у поле, пасля яшчэ — падвячорак.

— Найбольш трывалае валакно атрымліваецца з доўгіх сцяблін — аптымальна ад 90 сантыметраў да 1,1 метра, — уступае ў размову **галоўны аграном прадпрыемства Артур ШКЛЯРЭЎСКІ**. — Перавагу аддаём айчынным сартам, якія лепш адаптаваныя да нашых кліматычных умоў. «Замежнікі» займаюць толькі 30% плошчаў. У гэтым урочышчы пасеяны сорт беларускай селекцыі «Грант». Ён дае добры выхад доўгага валакна, што дазволіць адмовіцца ад закупак насення. Два папярэднія гады не ўдавалася сабраць яго дастаткова. Спадзяёмся, што сёлета забяспечым сваю вытворчасць якасным матэрыялам і насеннем да атрымання новага ўраджаю. А лішкі прадукцыі рэалізуем на экспарт.

*Усяго ў Мінскай вобласці неабходна ўбраць лён-даўгунец з плошчы 8939 гектараў, валавы збор ільнотрасты складзе не менш як 29,5 тыс. тон (тэмп росту да 2016 года — 133%). Ураджайнасць чакаецца 32,9 цэнтнера з гектара, летась сабралі 26,5 цэнтнера.*

*Для выхаду на прыбытковую работу іншых перапрацоўчых заводаў Міншчыны пры тым абсталяванні, што ёсць, плануецца штогод перапрацоўваць не менш як 28,2 тыс. тон ільнотрасты, сярэднім нумарам 1,04, выпускаць 7,9 тыс. тон ільновалакна, у тым ліку 2,4 тыс. тон доўгага. Вядома, на прадпрыемствах наспела мадэрнізацыя, на яе праведзенне патрабуецца 33,8 млн рублёў. Яна дапаможа рэзка нарасціць аб'ёмы вытворчасці льновалакна, палепшыць яго якасць і рэнтабельнасць усёй галіны.*

*— Лён — асаблівая культура, і падыход да яго таксама павінен быць асаблівы, — падкрэсліў **старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА**, які прыехаў на поле, каб паглядзець, як ідзе ўборка «блакітнага золата». — Перш за ўсё неабходна вырасціць якасную сыравіну, якасна яе ўбраць і перапрацаваць. Натуральна, перапрацоўка на мадэрнізаваных і на старых заводах адрозніваецца. Тым не менш выхад па доўгім і кароткім валакне павінен адпавядаць нарматыву. На гэта мы і накіраваныя. Сёлета плануецца атрымаць ураджай на 30% большы, чым летась, як у колькасным, так і ў якасным выражэнні, што прынясе грашовую прыбытку і дазволіць працаваць прыбыткова. Вырашчана каля 9 тыс. гектараў даўгунцу, убрана больш за 70% плошчаў. Мяркуем да 25 жніўня завяршыць, а да 25 верасня паднякць і звесці ўвесь ураджай на захаванне.*

*Як адзначыў губернатар, ёсць і праблемы. « Але мы іх бачым, ведаем як вырашаць, — падкрэсліў Анатоль Ісачанка. — Былі, у прыватнасці, пытанні па наладцы абсталявання, але спецыялісты ліквідавалі ўсе недахопы, і яно цяпер спраўна працуе. Яшчэ адна праблема — падбор палёў, насення, работа насенных станцый. Мы абмеркавалі спектр пытанняў і намецілі планы па іх вырашэнні. Думаю, зрухі будуць істотныя».*

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НАТА падтрымала новую стратэгію ЗША па Паўднёвай Азіі і Афганістане

Пра гэта заявіў генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг. Напярэдадні новую стратэгію агучыў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. Яна пацвярджае, што амерыканскія ваенныя застануцца ў Афганістане на доўгатэрміновай аснове. Трамп падкрэсліў, што ЗША не дапусцяць у Афганістане паўтарэння «іракскай памылкі», калі пасля хуткага вываду амерыканскіх войскаў у 2011 годзе ў краіне сфарміраваліся ўсе ўмовы для хуткага развіцця тэрарыстычнай арганізацыі «Ісламская дзяржава». «Нашай мэтай застаецца гарантаваць, што Афганістан ніколі зноў не стане цёхай гаванню для тэрарыстаў», — заўважыў Столтэнберг.

### Еўрасаюз гатовы аказаць дапамогу Італіі пасля землятрусу на Іск'і

Аб гэтым гаворыцца ў заяве еўракамісара па пытаннях гуманітарнай дапамогі і кіраванні крызіснымі сітуацыямі Хрыстаса Стыліяніdзіса. У выніку землятрусу на востраве Іск'я ў Тырэнскім моры каля 2,6 тысячы чалавек засталіся без прытулку, паведаміў кіраўнік нацыянальнай службы грамадзянскай абароны Італіі Анджэла Барэлі. Пашкоджана таксама інфраструктура, бальніцы і цэрквы. Па даных мясцовых уладаў, у выніку стыхійнага бедства загінулі дзве жанчыны, параненыя 39 чалавек. Эпіцэнтр землятрусу знаходзіўся ў непасрэднай блізкасці ад заходняга ўзбярэжжа вострава ў моры на глыбіні прыкладна 10 кіламетраў. Па даных сейсмолагаў, за першым падземным штуршком зафіксаваны яшчэ 14 слабейшых афтэршокаў.

### Звон Біг-Бэна ў Лондане прагучаў апошні раз



Пасля гэтага яго адключылі, каб адрэстаўраваць і гадзіннік, і саму вежу. Гадзіннік пачалі разбіраць на складальныя часткі. Усе чатыры цыферблаты пачысцяць і адрэстаўруюць. Прадстаўнікі парламента заяўляюць, што гадзіннікавы механізм Біг-Бэна спынены дзеля бяспекі спецыялістаў, якія задзейнічаны на аднаўленчых работах. Зрэшты, на працягу рамонту па асаблівых выпадках звон будуць падключаць — напрыклад, у навагоднюю ноч ці ў Дзень памінання. Аднаўленчыя работы абыдуцца ў €29 мільёнаў (каля $37 млн). Захавальнік гадзінніка Стыў Джэгс кажа, што маўчанне Біг-Бэна стала «значным паваротным момантам» у рэстаўрацыі вежы.

# І смачна, і прыгожа, і нядорага

## Што рабіць, каб вучні не адмаўляліся ад школьнага абеду?

**Перапынкі паміж прыёмам ежы ў дзяцей не павінны перавышаць 3,5—4 гадзіны. Пра гэта павінны памятаць бацькі, якія адпраўляюць сваё дзіця ў школу. А калі вучань знаходзіцца ва ўстанове адукацыі да вечара, то трэба клапаціцца пра дадатковы прыём ежы, няважна дзе: у сталовай, буфеце ці ў школьным кафэ.**

— Ніякае так званае бартавое харчаванне, якое дастаўляецца і разаграваецца на месцы, ці ссабойка гарачае харчаванне замяніць не могуць, — упэўнена **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА**. — Сістэма харчавання з патэльні — самая аптымальная. Выпадкі, калі дзіця не есць у сталовай, павінны быць выключэннем. Так, ёсць дзеці, якія катэгарычна адмаўляюцца харчавацца ў школе, і ёсць дзеці, якія на выдзеленыя ім на харчаванне ў школьнай сталовай сродкі набываюць малакарысныя ці ўвогуле шкодныя для здароўя прадукты.

Зразумела, што дзеці хочуць, каб у школьнай сталовай смачна кармілі, а гэта ў многім залежыць ад кваліфікацыі кухараў. Паводле сучасных патрабаванняў, ва ўстановах адукацыі могуць працаваць кухары з кваліфікацыяй не менш за чацвёрты разрад. Але з прычыны невысокіх заробкаў сёння адчуваецца дэфіцыт адпаведных кадраў, асабліва ў сельскай мясцовасці.

55 працэнтаў школьнікаў у краіне ахоплены камбінатамі школьнага харчавання. У Мінску гэты паказчык увогуле дасягае 98 працэнтаў. А, напрыклад, у Мінскай вобласці 94% устаноў адукацыі самі забяспечваюць харчаванне сваіх навучэнцаў. Атрымліваецца танней, таму што на стол да школьнікаў трапляе сельгаспрадукцыя мясцовай вытворчасці...

— Кошт харчавання залежыць ад некалькіх фактараў. Напрыклад, ад узросту вучняў, ад таго, хто арганізуе харчаванне — сама школа, камбінат школьнага харчавання або індывідуальны прадпрымальнік, — тлумачыць **галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра АЛЯКСЕЕВА**. — Штоквартальна аналізуецца рост індэкса спажывецкіх цэн, і, калі ён перавышае допушчальны парог, грашовыя нормы на харчаванне карэктуюцца. Апошні раз гэта адбылося ў лютым.

У мінулым навучальным годзе сярэдні кошт абеду для мінскіх школьнікаў вагаўся ад 2 рублёў 40 капеек да 2 рублёў 60 капеек. І гэта самыя высокія паказчыкі па краіне. У рэгіёнах лічбы намнога меншыя: у залежнасці ад узросту ад 1,43 да 1,73 рубля.

— Па даных выбарачнага анкетавання, праведзенага санітарнай службай, на першым месцы сярод прычын, па якіх дзеці адмаўляюцца харчавацца ў школе, стаіць знешні выгляд кухараў. Калі дзіця ўбачыць неакуратнага работніка сталовай ці ў кухара будуць брудныя рукі, яно ніколі не будзе там харчавацца, — падкрэслівае Ала Малахава. — Эстэтычны бок (знешні выгляд кухараў, сервіроўка сталоў, посуд, афармленне памяшканняў сталовых, мэбля) насамрэч вельмі важныя. Дарэчы, яшчэ тры гады таму наяўнасць у работнікаў сталовых аднаразовых пальчатак стала абавязковай: толькі ў пальчатках яны могуць штосьці наразаць ці раздаваць дзецям ежу.

Таксама важна ўлічваць і такую акалічнасць, як узрост школьнікаў: вязкую рысавую кашу старшакласнік наўрад ці будзе есці, а вось ад рассыпістага рысу з агароднінай ён не адмовіцца.

На думку спецыялістаў, для таго каб бацькі былі ўпэўненыя ў тым, што дзіця харчуецца здаровай ежай у школе, а не піцай ці смажанкай у бліжнім магазіне, трэба шырэй укараняць ва ўстановах адукацыі безнаяўную форму аплаты за харчаванне вучняў. Дарэчы, гэтым шляхам ужо ідуць у сталіцы. У цяперашні час складаюцца спісы навучэнцаў для прысвоення кожнаму з іх асабістага кода і далейшага ўкаранення персаніфікаванай формы аплаты за харчаванне праз сістэму АРІП. Для забеспячэння вучняў паўнавартасным збалансаваным харчаваннем распрацаваны адзіныя прыкладныя двухтыднёвыя рацыёны харчавання для ўсіх устаноў агульнай сярэдняй адукацыі — як за кошт бюджэтных сродкаў, так і за кошт сродкаў бацькоў. Яны залежаць і ад сезона: восень — зіма і вясна — лета.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ДАПАМОЖА КОНСУЛЬСТВА

**Міністэрства замежных спраў са шкадаваннем успрыняло паведамленне аб тым, што пасольства ЗША ў Расіі спыніла прыём дакументаў на афармленне віз для грамадзян Беларусі. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК, адказваючы на пытанне міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Россия сегодня».**

«Спадзяёмся, што, прыняўшы сённяшняе рашэнне, амерыканскі бок знойдзе магчымасць пашырыць работу консульскага аддзела свайго пасольства ў Мінску, — адзначыў Дзмітрый Мірончык. — Упэўнены, што атрыманне грамадзянамі Беларусі магчымасці афармляць візы ў ЗША без выезду ў сумежныя краіны садзейнічала б пашырэнню міжасобасных кантактаў, а таксама развіццю супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі».

Міністэрства замежных спраў таксама заклапочана тым, што «адносіны паміж Расійскай Федэрацыяй і Злучанымі Штатамі працягваюць ускладняцца і гэта ўжо негатыўна адбіваецца непасрэдна на простых беларусах». «Кіруючыся ў першую чаргу інтарэсамі Беларусі і яе грамадзян, выказваем надзею на хуткую нармалізацыю расійска-амерыканскіх адносін, якая, мы ўпэўненыя, пазітыўна адбілася б на сітуацыі ў свеце ў цэлым», — заявіў прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## ПЛАНЫ НАЙБУЙНЕЙШАГА ФАРМВЫТВОРЦЫ

**Да 2020 года «Белмедпрэпараты» выпусцяць інсуліны ў картрыджнай форме, для чаго гэтай восенню будзе зманціравана новае абсталяванне.**

Зараз прэпараты ў форме картрыджаў закупаюць, фасуюць іх і ўпакоўваюць. Плануецца запусціць і выраб цытастатычных прэпаратаў у таблетках і капсулах для лячэння анкалагічных хвароб. Дарэчы, сёння прадпрыемства забяспечвае 70 працэнтаў патрэб айчыннай аховы здароўя ў такіх леках.

Паводле слоў **генеральнага дырэктара РУП «Белмедпрэпараты» Паўла КАХАЎЦА**, у перспектыве неабходна працаваць над мінімізацыяй затрат з дапамогай вырабу ўласных субстанцый, 80 працэнтаў з якіх сёння завозяцца з Кітая і Індыі. Неабходна таксама ўдзяляць большую ўвагу новым высокатэхналагічным прадуктам. Напрыклад, медыкаментознае суправаджэнне пацыентаў пасля перанесеных трансплантацый пакуль імпартнае. Для дыягнастычнай апаратуры патрабуюцца спецыяльныя рэнтгенкантрасныя рэчывы, якія таксама не вырабляюцца ў нашай краіне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ВЫКАПАЦЬ БУЛЬБУ ПА ДАСТУПНАЙ ЦАНЕ

**прапануе пенсіянерам Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Брэсцкага раёна.**

У шэрагу платных паслуг названага цэнтра ёсць шмат сельскагаспадарчых работ сезоннага характару. Работнікі ўстановы выкапаюць бульбу, выберуць моркву і буракі, затым заараць зямлю, могуць нават сфарміраваць грады пад пасадку агародных культур на зіму. Па заяўцы пенсіянера альбо інваліда работнікі выедуць у вёску, каб скасіць траву, перанесці ў хлеў торфабрыкет альбо вугаль, адрамантаваць цяпліцу. Як заверылі ў Цэнтры, кошт платных паслуг для гэтай катэгорыі насельніцтва прымальны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## АД ПАДАТКУ ВЫЗВАЛЯЮЦЦА...

**Інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску нагадвае, што з моманту набыцця другой кватэры (у тым ліку долі ў праве на яе) фізічныя асобы — грамадзяне Беларусі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства — з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на нерухомасць з адной з прыналежных кватэр.**

Плацельшчык мае права самастойна вызначыць тую кватэру, якая не будзе абкладацца падаткам на нерухомасць. Для гэтага яму неабходна падаць у падатковы орган па месцы сваёй рэгістрацыі адпаведную заяву.

Увага! Сёлета стаўка падатку на нерухомасць для мінчан — уласнікаў двух і больш жылых памяшканняў у шматкватэрных і блочных жылых дамах з улікам павышальнага каэфіцыента, устаноўленага рашэннем Мінскага гарадскога савета дэпутатаў, складае 0,4% ад ацэначнага кошту кватэры. Аплата падатку на нерухомасць ажыццяўляецца на падставе паведамлення падатковага органа не пазней за 15 лістапада бягучага года. Шматдзетныя сем'і поўнасцю вызваляюцца ад аплаты падатку ў дачыненні да ўсіх кватэр, якія належаць ім на праве ўласнасці..

**Сяргей КУРКАЧ.**

# З-ЗА ЧАГО ГІНУЦЬ НАШЫ ДЗЕЦІ?

**Да пачатку чарговага навучальнага года застаецца крыху больш за тыдзень. У гарады масава вяртаюцца дзеці пасля летняга адпачынку. Але знаходзячыся некаторы час па-за межамі буйных населеных пунктаў, паціху адвыкаеш ад інтэнсіўнасці руху на вуліцах. А дарога — суддзя жорсткі і памылак не даруе.**



— За першыя паўгода ў Беларусі ад знешніх прычын загінулі 52 дзіцяці, — зазначыў **намеснік дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Леанід ЛОМАЦЬ**. — Летась жа такіх выпадкаў было 77 за такі ж перыяд. Істотна знізілася смяротнасць ад дарожна-транспартных здарэнняў, падзенняў і ўтапленняў. Натуральна, на сёлетнюю статыстыку паўплывають яшчэ ліпень і жнівень. Але спадзяёмся, што мінулы год гэтыя сумныя лічбы не перасягнуць.

Пры гэтым паказчыкі дзіцячага траўматызму змяншаюцца ўжо некалькі гадоў. Напрыклад, у 2011 годзе смяротнасць непаўналетніх ад знешніх прычын складала 15,4 на 100 тысяч дзяцей. А летась — ужо 8,4. Але бездакорныя паводзіны часта заканчваюцца і сур'ёзнымі траўмамі, жыць з якімі давядзецца дзясяткі гадоў.

— Да нас у цэнтр пастаянна паступаюць падлеткі, якія ныраюць у месцах, што кепска ведаюць, — працягвае Леанід Ломаць. — І, як правіла, атрымліваюць траўмы шыйнага аддзела пазваночніка. Пералом у такім месцы заўжды страшны. Калі ён не такі моцны, то яшчэ магчымае нейкае аднаўленне, а вось калі пераломам суправаджаецца разрывам спіннога мозгу — то гэта інваліднасць на ўсё жыццё. Ці варта геройстваваць дзеля такіх наступстваў?

### Сеў на веласіпед — надзеў шлем?

Апошнім часам у краіне пачаў набіраць абароты веласіпедны рух. З аднаго боку, гэта вельмі добра — усё больш людзей далучаецца да вядзення здаровага ладу жыцця. А з іншага? Артыкул 148 Правілаў дарожнага руху рэгламентуе, што веласіпедысты мусяць рухацца па спецыяльнай дарожцы, а пры яе адсутнасці — па ўзбочыне, тратуары і пешаходнай дарожцы, не перашкаджаючы пры гэтым іншым. Калі ж усяго гэтага набору няма, то рух веласіпедыстаў дазваляецца па праезнай частцы, але не далей за адзін метр ад яе правага краю. Вось толькі часта даводзіцца назіраць сітуацыю, амаль як у «Барадзіне» Лермантава — «Смешались в кучу кони, люди...» Асабліва гэта датычыцца старых кварталаў, дзе тратуары 40—60 гадоў таму наўрад ці разлічваліся пад тое, што па іх будуць не толькі хадзіць людзі, але і масава ездзіць веласіпедысты.

— Цяпер распрацоўваецца новая канцэпцыя веласіпеднага руху, — кажа Леанід Ломаць. — Сярод траўмаў, якія атрымліваюць веласіпедысты і пешаходы, часта рэгіструюцца пашкоджанні галавы. Завяршыцца яно можа цяжка, нават да лятальнага канца. Вядома, калі не глядзець па баках і не выкарыстоўваць сродкі засцярогі. Вось зараз абмяркоўваецца пытанне — ці трэба абавязваць карыстацца веласіпеднымі шлемамі? Ці, напрыклад, накаленнікамі. Здаецца, пры падзенні траўма няцяжкая. А пасля на гэтым месцы ўзнікаюць артрозы, і ўсё можа скончыцца пры найгоршым раскладзе эндапратэзаваннем. Ёсць у свеце краіны, дзе ўвялі абавязковыя велашлемы. Сярод іх — Аўстралія, Новая Зеландыя...

### У школах з'явяцца пашпарты дарожнай бяспекі

Шлях з дому ў школу рэдка пралягае так, каб не трэба было пераходзіць адну ці некалькі дарог ці пятляць па дваравых праездах, спрэс запаркаваных аўтамабілямі. А значыць, рызыка незнарок сунуцца пад колы машыны ўзрастае шматкроць.

— Сёлета на кожную ўстанову адукацыі будзе заведзены пашпарт дарожнай бяспекі, — кажа **старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Ганна БАНАДЫК**. — Ён быў распрацаваны яшчэ летась і змяшчае практычна ўсю інфармацыю аб школе — пра час заняткаў, колькасць змен, уладальніка дарог каля ўстановы, школьны аўтобус, поўную інфармацыю пра арганізацыю дарожнага руху побач са школай. Таксама ў ім вялікая ўвага ўдзяляецца маршруту бяспечнага руху «дом—школа—дом» для вучняў і бацькоў. Акрамя таго, у школы перададзены інтэрактыўныя камп'ютарныя праграмы для дзяцей, з дапамогай якіх можна як выкладаць, так і правяраць веды датычна правільных паводзін на дарозе.

Гэты пашпарт захоўваецца і ва ўстанове адукацыі, і ў мясцовым аддзеле ДАІ. Ён абавязкова прыкладаецца да пашпарта гатоўнасці школы да чарговага навучальнага года.

## Вы ўтрымаеце на руках 350 кілаграмаў?

— Калі 10 гадоў таму 70—80% ДТЗ з удзелам дзяцей адбываліся па іх віне, то цяпер сітуацыя развярнулася наадварот, — працягвае Ганна Банадык. — Сёлета зарэгістравана 137 аварый з непаўналетнімі, 8 дзяцей загінула. Сярод іх — трое пасажыраў, чатыры пешаходы і адзін веласіпедыст. 62 дзяцей-пасажыры аўтамабіляў атрымалі траўмы, 22 былі збіты на пешаходных пераходах. І ўжо за жнівень дарога забрала тры дзіцячыя жыцці. Што да аўтамабіляў, то знізіць дзіцячы траўматызм дапамагаюць аўтакрэслы. Лепш за такія ўстройствы нічога не прыдумана. Яны сканструяваны з улікам усіх асаблівасцяў арганізма. Дзеці, якія знаходзяцца ў такіх прыладах, атрымліваюць нязначныя траўмы. Гэта парэзы твару, ушыбы. Але не страшныя пераломы.

Бацькі, якія не хочуць набываць аўтакрэсла і сцвярджаюць, што здолеюць утрымаць малога на руках, распісваюцца ў няведанні законаў фізікі. Напрыклад, маса аднагадовага дзіцяці складае звычайна 10—12 кілаграмаў. Калі ж аўтамабіль, у якім едзе малы, сутыкнуўся ў лабавую на самай высокай хуткасці ў 40 кіламетраў за гадзіну, то вага малога (якую не трэба блытаць з масай) павялічыцца ў 35 разоў. Вы ўтрымаеце на руках 350—420 кілаграмаў?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# У фармаце калектыўнай арэнды

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер група студэнтаў смела заказвае сабе пэўнае жыллё праз агенцтва нерухомасці і ўжо нічога не баіцца. Не скажаш, што ўласнікі кватэр ахвотна ідуць на такое засяленне, але і катэгарычна «не» не гавораць. Як правіла, кансенсус знаходзіцца за кошт некаторага ўзняцця кошту арэнды. Напрыклад, калі аднаму чалавеку аднапакаёўка здавалася б за 180 долараў, то для некалькіх студэнтаў уласнікі часта ўжо просяць 200 «зялёных».




## Гістарычны мінімум

Ёсць меркаванне, што ў свеце ўсё цыклічнае. Вось і цяпер кошт доўгатэрміновай арэнды кватэр у Мінску апусціўся да ўзроўню 12-гадовай даўнасці, а дакладней, лета 2005-га.

З надыходам стабільнага 2017-га арэндадаўцы спадзяваліся на спыненне зніжэння ставак арэнды, але гэтага не адбылося — паводле звестак нерухомасці «Твая сталіца», за першае паўгоддзе кошт арэнды кватэр у Мінску знізіўся яшчэ ў сярэднім на 7% да ўзроўню 180 долараў за аднапакаёвую, 220 долараў за двухпакаёвую і 250 долараў за трохпакаёвую кватэру. Як адзначаюць сталічныя аналітыкі, апошні раз падобны ўзровень цэн адзначаўся ў 2005 годзе.

Аднак у той час і даходы ў людзей былі зусім іншыя. Напрыклад, сярэдняя намінальная налічаная заработная плата беларуса летам 2005 года складала каля 230 долараў. Такім чынам, пасля аплаты за арэнду аднапакаёвай кватэры ў кватаранта заставалася толькі трэць ад заработнай платы, а двухпакаёвай — толькі 9%. І гэта без уліку кошту камунальных плацяжоў. А калі б сярэднестатыстычны беларус вырашыў арандаваць трохпакаёвую кватэру, то яму прыйшлося б для яе аплаты браць крэдыт.

У цяперашні час, сярэдняя намінальная налічаная заработная плата практычна ўдвая большая, а менавіта прыкладна 420 долараў. Прытрымліваючыся ранейшай методыкі разлікаў, можна канстатаваць, што летам 2017-га сярэднестатыстычны беларус можа на адну такую зарплату арандаваць не толькі аднапакаёвую, але нават і трохпакаёвую кватэру, і пры гэтым у яго будзе заставацца мінімум 40% ад заработнай платы.

## Рэальныя цэны

Па цэнніку 170—190 долараў знайсці можна аднапакаёвую кватэру стандартнай якасці практычна ў любым раёне горада. Гэта будзе жыллё з нястарой мэбляй, бытавымі прыборамі, і калі пашанцуе — з пральнай машынай. Зразумела, што мінімальныя цэны кватэр знаходзяцца на ўзроўні 150 долараў для аднапакаёвых, 190 долараў для двухпакаёвых і 210 долараў для трохпакаёвых. Але трэба разумець, што за гэтыя сумы можна разлічваць у лепшым выпадку толькі на пустую кватэру, якая патрабуе правядзення тэрміновага касметычнага рамонту.

У жніўні-верасні найбольшай папулярнасцю карыстаюцца аднапакаёвыя кватэры — на іх долю прыпадае больш за палову ўсіх запытаў ад арандатараў. Двух- і трохпакаёвыя кватэры запатрабаваныя значна менш — іх доля ў попыце 30% і 20% адпаведна.

## «Люксаў» не хапае

З асаблівасцяў бягучага перыяду можна назваць недахоп шматпакаёвых кватэр «Прэміум» і «Прэміум-Люкс» класаў. У апошнія гады ў Мінск усё часцей сталі прыязджаць замежныя грамадзяне (прадстаўнікі кампаній, бізнесмены), якія для пражывання шукаюць сучасныя камфартабельныя і цалкам укамплектаваныя мэбляй і бытавой тэхнікай кватэры. У іх разуменні гэта павінна быць кватэра з двума або больш пакоямі, якая размяшчаецца ў новым сучасным доме, пажадана як мага бліжэй да цэнтра горада ці на асноўных вуліцах. Часам падобныя арандатары згаджаюцца на падызайнерску ўладкаваныя «сталінкі», але ў большасці выпадкаў, нават калі ім падабаецца сама кватэра, то ўсё ўражанне псуе стан пад'езда такіх дамоў.

## Парада ад падаткавікоў і практыкаў

Нягледзячы на магчымую спешку ў пошуку кватэры, я параіў бы ўсім кватарантам і гаспадарам не забываць заключаць дагавор арэнды і прапісваць у ім усе важныя моманты: такія, як стан кватэры, наяўнасць мэблі і бытавой тэхнікі. А таксама правільна афармляць унясенне страхавога дэпазіту. Але канкрэтна аб тым, як гэта рабіць, мы пагаворым пазней.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Хакей

# ГАЛОЎНАЯ МЭТА ПА-РАНЕЙШАМУ — ПЛЭЙ-ОФ

## Мінскае «Дынама» стартуе ў дзясятым сезоне КХЛ

**Матч-адкрыццё адбыўся яшчэ ў панядзелак, у ім піцерскі СКА нанёс паражэнне маскоўскаму ЦСКА. А вось мінскія хакеісты пачынаюць новы хакейны год сёння, з дамашняй серыі на «Мінск-Арэне», дзе сустракаюцца з фінскім «Ёкерытам». Напярэдадні першага матча мы пазнаёміліся з новым трэнерам «зуброў» і даведаліся пра задачы каманды ў гэтым сезоне.**



У міжсезонні каманду ўзначаліў Гордзі Дуаер, 39-гадовы канадскі трэнер, які з 2015 года ўзначальваў каманду «Мядвешчак», а таксама ўваходзіў у трэнерскі штаб зборнай Канады. Раней ён быў галоўным у швейцарскім «Амбры-Піёта» і асістэнтам галоўнага трэнера юнацкай зборнай Канады. У якасці гульца Дуаер правёў 108 матчаў у НХЛ за «Тампу», «Нью-Ёрк Рэйнджарс» і «Манрэаль». Гуляў у АХЛ, камандах Швецыі і Германіі.

У Мінск Дуаер прыехаў з сям'ёй, ён адзначае, што яшчэ не вельмі добра пазнаёміўся горадам, а вось тры сыны і жонка ўжо арыентуюцца ў беларускай сталіцы.

— Ім асабліва спадабаўся Чырвоны касцёл. Яшчэ дзеці эмацыйна дзеляцца ўражаннямі пасля паходу ў аквапарк, — расказвае Гордзі. — Спадзяюся, у найбліжэйшы час наведаем музей Вялікай Айчыннай вайны. Што датычыцца горада, то магу сказаць пра яго толькі пазітыўнае. Адчуваю сябе ў Мінску як дома.

Цяпер бліжэй да хакея. Новы трэнер «зуброў» кажа, што быў прыемна здзіўлены, калі зразумеў, якая важная для Беларусі гэтая гульня — як для журналістаў, так і для балельшчыкаў. У якасці сваёй галоўнай асаблівасці трэнера ён называе адкрытасць у адносінах да хакеістаў і творчы падыход. «Неабходна канцэнтравацца не толькі на глабальных аспектах, але і на дробязях», — лічыць Дуаер.

Многія гульцы «Дынама» напярэдадні прызнаваліся журналістам, што цяперашняя перадсезонная падрыхтоўка была вельмі цяжкай, вялікі акцэнт канадзец зрабіў менавіта на фізічную падрыхтоўку спартсменаў. Ён абгрунтоўвае гэта тым, што ў 2018-м будуць Алімпійскія гульні, а значыць, трэба, каб гульцы на працягу ўсёй «рэгуляркі» знаходзіліся ў тонусе і былі гатовыя да жорсткага графіка, бо потым падцягнуць іх «фізуху» магчымасці ўжо не будзе.

Падчас міжсезоння «зубры» згулялі толькі 7 матчаў, правесці больш сустрэч проста не было магчымасці. Аднак, на думку трэнера, і гэтыя паядынкі аказаліся важныя і паказальныя.

— На «Кубку Мінска» мы змаглі ацаніць магчымасці многіх маладых беларускіх хакеістаў — тады яшчэ не ўсе легіянеры далучыліся да каманды. Затое ў Рызе ўжо правільна размеркавалі трэніровачныя нагрузкі і знайшлі аптымальныя гульнявы час для ўсіх. Латвійскі турнір стаў вельмі каштоўным этапам падрыхтоўкі да рэгулярнага чэмпіянату. Галоўнае — пасля яго з'явілася разуменне, што трэба мяняць і над чым працаваць.

Што датычыцца задач мінскага клуба ў цяперашнім сезоне, то Дуаер адзначае: галоўнае — з цягам часу станавіцца ўсё мацнейшымі. З аднаго боку, развіваць беларускую моладзь, а з другога — рабіць упор на камандную гульню, якая дазволіць прыйсці да галоўнай мэты — выхаду ў плэй-оф. Ясна канадзец разважае і пра адносіны нацыянальнай зборнай Беларусі і галоўнага хакейнага клуба краіны.

— Гэта дзве зусім асобныя арганізацыі. З моманту майго з'яўлення ў Мінску паміж імі ўсталяваліся добрыя адносіны. Мы ўжо правялі паспяховыя перагаворы, якія датычаць скаўтынга, прагляду некаторых маладых талентаў у «Дынама». Разам з кіраўніцтвам Федэрацыі хакея Беларусі шукаем таленавітых выканаўцаў, якія маглі б дапамагчы і «Дынама», і зборнай. Ягор Шаранговіч — паспяховы таму прыклад. У мяне можа атрымаць шанц любы, незалежна ад узросту.

Пажадаем камандзе і новаму трэнеру поспехаў у сезоне і адзначым, што пасля сённяшняга матча з «Ёкерытам» 25 жніўня «зубры» сустрэнуцца з падмаскоўным «Віцязем», а 27 жніўня — з маскоўскім ЦСКА.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Ці чулі?

# Знайсці выйсце... з кукурузнага поля

## Каля Дзяржынска адкрыўся адмысловы парк забаў

**Ідэя адкрыць парк забаў дзесьці пасярод маляўнічых беларускіх прастораў — напрыклад, у кукурузным полі — проста лунала ў паветры. І вось у мінулыя выхадныя яе-такі ажыццявілі. Непадалёк ад Дзяржынска, на радасць гараджанам, што прыязджаюць сюды ў тым ліку і з Мінска, запрацаваў лабірынт.**



«Кукуполіс» — так называецца парк забаў, што размясціўся на хутары Лізавецін Дзяржынскага раёна. Пасярод кукурузы і сапраўды пракладзены сцяжынкі, пастаўлены адмысловыя пікеты. Цікава, што калі глядзець на ўсё гэта з вышыні птушынага палёту, то можна ўбачыць, што са сцяжынак вымалёўваецца галава казачкі, а яшчэ — словы «за Беларусь».

Сам лабірынт зроблены ў выглядзе карты Беларусі. Блукаючы пасярод кукурузы, удзельнікі мусяць адшукаць усе абласныя гарады, а таксама некалькі дадатковых пікетаў.

Сабраўшы ўсе адзнакі на сваёй маленькай карце, траляеш у забаўляльную зону. Там можна наведаць кантактны заапарк — убачыць коз, трусоў, барана, парасят розных дэкаратыўных парод, пакатацца на кані ці поні. Непадалёк адбываецца дэгустацыя малочнай прадукцыі, якую пры ахвоце можна набыць. Ёсць магчымасць паглядзець на жывёл, якія жывуць на ферме. Усё гэта, між іншым, экзатычныя цікавінкі для гараджан і іх дзяцей!



Ахвотныя могуць палазіць на скаладроме, пастраляць з лука. І нават палятаць на самалёце. Акрамя асноўнага лабірынта, ёсць яшчэ дзіцячы, зроблены з саломы.

Адміністратар Ксенія Ісакава і менеджар па рабоце з кліентамі «Кукуполіса» Алена Баравік расказалі, што яны пакуль знаходзяцца ў творчым пошуку, а ў будучым плануецца распрацаваць розныя тэматыкі для ўсіх выхадных. Магчыма, зробяць адмысловую праграму па «Алісе ў краіне цудаў» для дзяцей. А таксама створаць начны квэст.

Заснавальнік «Кукуполіса» **Аляксандр ПАЖАРАНКА з'яўляецца магістрантам эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.** Ён расказаў карэспандэнту «Звязды», як прыйшла ідэя такога лабірынта:

— Кожны раз, калі выязджаю за мяжу, у мяне з'яўляецца пэўная ідэя, якую трэба рэалізаваць у Беларусі. Калі ездзіў у Германію, я быў у такім жа лабірынце пасярод кукурузы і вырашыў, што трэба тое ж ажыццявіць у нас. Па водгуках, якія я чуў, мы зрабілі ўсё на вельмі высокім узроўні. Бо такія лабірынты ёсць і ў іншых краінах, але наш — проста цудоўны... Увосень я ўспомніў пра сваю ідэю, напісаў бізнес-план для конкурсу. А пасля высветлілася, што яшчэ ў фермера Дзмітрыя Крылова была такая ідэя. Мы аб'ядналіся і ўсё зрабілі разам.

Увесну адмыслова засаджвалася кукурузнае поле. Падрыхтоўка была вельмі карпатлівая. Частку парасткаў кукурузы вырывалі адразу. Сцежкі рабілі са спецыяльных драўляных трэсак. Адкрыццё лабірынта планавалі на пачатак жніўня. Але паколькі з-за халадоў сцябліны кукурузы не паспелі вырасці, тэрмін крыху перанеслі.

Забаўка будзе дзейнічаць да канца кастрычніка, пакуль расце кукуруза. А пасля гэтага яе, як звычайна, сажнуць — зерне адправяць для кармавых патрэб. Падаецца, гэта вельмі ўдалы прыклад прадстаўлення турыстычных паслуг па-беларуску.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

*Дзяржынскі раён*



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
23 жніўня 2017 г.
№31 (415)



3 стар.

**На што людзі скардзяцца?**



5 стар.

**Запасы вады не бясконцыя**



8 стар.

**Ініцыятыва вітаецца... і аплачваецца**

ТЭМА ТЫДНЯ

# СПАЖЫВЕЦ — НЕ СКАРЖНІК, А КЛІЕНТ,

## або Час змяняць стэрэатыпы ў сістэме ЖКГ

**Пра ваду, смецце і цяпло па справядлівых тарыфах з улікам экалогіі, клімату і геаграфіі размаўлялі ўдзельнікі пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі і Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў прысутнасці (па відэасувязі) кіраўніцтва усіх абласцей Беларусі. Важнасць дасканалай работы і далейшага развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны зразумелая кожнаму чалавеку. Пры гэтым сістэма ЖКГ знаходзіцца на стыку ўсіх галін эканомікі і непасрэдна інтарэсаў насельніцтва, на яе ўскладзены неапраўдана высокія чаканні з боку грамадства і расходы, якія камунальнікам прыходзіцца несці, выконваючы не толькі свае, а і шэраг не ўласцівых ім абавязкаў і функцый. На пасяджэнні пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча спецыялісты разгледзелі шэраг праблем і прапанавалі дзеянні для ўдасканалення заканадаўчай базы, якая датычыцца камунальнай гаспадаркі. Сёлета, у прыватнасці, запланавана карэкціроўка Жыллёвага кодэкса Беларусі і Закона «Аб пітным водазабеспячэнні».**



### Пітную ваду — абезжалезваць

Дзяржпраграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» прадугледжвае, што да 2020 года якасную пітную ваду будуць атрымліваць 100% карыстальнікаў.

Разам з тым 18,4% крыніц вады маюць павышанае ўтрыманне жалеза, а станцыямі абезжалезвання краіна забяспечана толькі на 42%. Каля чвэрці крыніц нецэнтралізаванага водазабеспячэння (у асноўным, у невялікіх населеных пунктах) не адпавядаюць патрабаванням па ўтрыманні ў вадзе нітратаў, а значыць — небяспечныя для карыстання.

— Каб палепшыць сітуацыю з утрыманнем у вадзе жалеза, у краіне трэба збудаваць крыху больш за 500 станцый абезжалезвання вады. Сёлета ў межах супрацоўніцтва з Сусветным банкам ужо распачата будаўніцтва 20 такіх станцый. З Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця адпрацавана пытанне будаўніцтва станцый першапачаткова ў Віцебскай вобласці (пры гэтым патрэбнасці вобласці поўнасцю будуць забяспечаны ўжо ў 2019-м), — пракаменціраваў сітуацыю **Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі.** — Эксперыментальны праект будзе пашыраны на ўсю краіну. Аднак адказнасць за гэтую сферу ляжыць на мясцовых органах улады, а паколькі за мінулы год уведзена усяго 13 станцый, бачна, што работа вядзецца недастатковая.

4 стар.

ДЗЕЛІМСЯ ДОСВЕДАМ

# ЗРАБІЛІ — І НЕ ШКАДУЕМ!

## Міханавіцкі сельвыканкам першы ў краіне стаў удзельнікам электронных таргоў

**У Мінскай вобласці ўпершыню былі арганізаваны электронныя таргі па зямельных участках на электроннай гандлёвай пляцоўцы «Беларускай універсальнай таварнай біржы». Першапраходцам у новай справе не толькі ў цэнтральным рэгіёне, але і наогул у Беларусі стаў Міханавіцкі сельвыканкам, які выставіў восем лотаў, у тым ліку шэсць — з прапановай участкаў у прыватную ўласнасць і два — у арэнду. Вынікі таргоў аказаліся даволі нядрэнныя — прададзена пяць участкаў. На два самыя дарагія (у вёсках Беразіна і Кацягі) у 15 сотак прэтэндавалі толькі па адным заяўніку. Участкі пайшлі па першапачатковай цане, павялічанай на 5%. На іншыя, з больш нізкім коштам, было па некалькі прэтэндэнтаў. У выніку канкурэнтнай барацьбы кошт іх значна павялічыўся.**

— Калі мы самі не паклапоцімся пра сваю зямлю, пра яе разумнае і рацыянальнае выкарыстанне, не навучымся зарабляць грошы, то хто зробіць гэта за нас? — тлумачыць сваю рашучасць у новай справе **старшыня Міханавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Святлана ДАВАЛЬЦОВА.** — Разумеем і тое, што нам трэба папаўняць бюджэт раёна, вобласці, краіны, а ўчасткі з пачатку года ў параўнанні з мінулымі гадамі прадаюцца слаба. Не хочацца скацііцца да той мяжы, каб нас датавала дзяржава.

Калі хтосьці самазаспакойваецца — маўляў, цяжкае эканамічнае становішча, у людзей грошай мала, то толькі не Давальцова. Яна даўно пачала шукаць новыя формы работы з патэнцыйнымі пакупнікамі. У кожнага сваё ўяўленне аб тым, як прадаваць зямлю. Старшыня сельскага Савета была ўпэўнена, што нельга гэтую справу камусьці даверыць або перадаверыць. Так яна выйшла на Беларускую таварную біржу, якая на рынку паслуг працуе больш за год, але ўжо займела бездакорную рэпутацыю і аўтарытэт сярод грамадзян і юрыдычных асоб. За адносна кароткі перыяд кліентамі біржы сталі ўсе абласныя тэрытарыяльныя фонды, а таксама шэраг дзяржаўных арганізацый. За час работы было створана



226 лотаў. У першую чаргу гэта нявыкарыстаныя аб'екты і аб'екты нерухомасці, якія неэфектыўна выкарыстоўваліся, а таксама аб'екты рухомай маёмасці. У выніку таргоў рэалізавана дзяржаўнай маёмасці больш як на 1,2 млн рублёў. Бюджэт атрымаў 430 тыс. рублёў.

2 стар.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ХУТКА Ў ШКОЛУ

## Сенатары прымаюць удзел у падрыхтоўцы да новага навучальнага года

**Прэзідыум Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу рэкамендаваў усім членам Савета Рэспублікі прыняць актыўны ўдзел у мерапрыемствах па падрыхтоўцы да новага навучальнага года, якія праводзяцца ва ўстановах адукацыі, сацыяльнага абслугоўвання і іншых арганізацыях сацыяльнай сферы. Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць гатоўнасці дзяцей з праблемных сем'яў, прыёмных, шматдзетных, малазабяспечаных, а таксама сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.**

Паводле слоў **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Мікалая РАДАМАНА**, падрыхтоўка да новага навучальнага года — справа адказная, і работа ў гэтым кірунку павінна весціся не толькі напярэдадні 1 верасня, але і на працягу ўсіх трох летніх месяцаў.

— Агракамбінат «Сноў», напрыклад, штогод дапамагае атрымаць пашпарты гатоўнасці двум сярэднім школам, у якіх вучацца дзеці работнікаў нашага сельгаспрадпрыемства, а таксама двум дашкольным установам. Сёлета выкананы капітальны рамонт двух класаў у Сноўскай СШ і касметычны рамонт асноўнага будынка, пераабсталяваны камп'ютарны клас.

Сноўскаму яслям-саду для рамонту выдзелена будаўнічых матэрыялаў на суму 475,94 рубля, таксама для малых уладкавалі спартыўную пляцоўку з бегавымі дарожкамі. Больш за тысячу рублёў пералічылі на рамонт Пагарэльцаўскай СШ і яслям-саду ў вёсцы Друцкаўшчына.

Паводле пісьмовых зваротаў кіраўніцтва двух дзіцячых дашкольных устаноў і двух школ, размешчаных на тэрыторыі Сноўскага сельсавета, арганізавана дастаўка бульбы для харчавання дзяцей.

— Не засталіся без увагі і шматдзетныя сем'і. Да 1 верасня 22 шматдзетным сем'ям для падрыхтоўкі дзяцей да школы аказана матэрыяльная дапамога на агульную суму 1540 рублёў.

Сенатар падкрэсліў, што ў рабоце са школай вялікая ўвага ўдзяляецца прафарыентацыі выпускнікоў і падрыхтоўцы будучых спецыялістаў для сельскай гаспадаркі. Напрыклад, сёлета на палях агракамбіната «Сноў» актыўна працавалі многія старшакласнікі. Першага верасня на ўрачыстых лінейках у Сноўскай СШ і Пагарэльцаўскай СШ ім будуць уручаны каштоўныя падарункі (акрамя афіцыйнай заработнай платы).

**Наталля БІТЭЛЬ.**

ШТО НОВАГА?

# З ХЛЕБАМ І ДА ХЛЕБА

## Мясцовыя ўлады расказалі, чым яны могуць паспрыяць вясковым жыхарам у «гарачую пару»

**Здалёк ад палёў чуваць водар спелага зерня і нагрэтай саломы — цудоўны для земляроба пах сабранага хлеба. Камбайны шчыруюць ад цямна да цямна, але заяздкае тэхніка не толькі на калгасныя землі.**

— Уборка збожжа на ўчастках вяскоўцаў — справа знаёмая і звыклая, з ёй мы спраўляліся ўсе гады. Не скажаць, праўда, што колькасць запытаў на тэхніку непад'ёмная, у нашай мясцовасці вялікі зямельны кавалак мала хто мае — стратна. Таму і сёлета не чакаем ажыятажу ні на камбайны, ні на бульбакапалкі, — кажа **Уладзімір ГАРДЗЕЙ, старшыня Любашаўскага сельскага Савета дэпутатаў Ганцавіцкага раёна.**

Па яго словах, большасць жыхароў апрацоўвае зямлю, як гэта яшчэ дзяды рабілі — запрагаюць у плуг коніка. Так нават зручней атрымліваецца, бо трактару на пяці «сотках» развярнуцца няма як. Гаспадарам, якія вырашылі ісці па «тэхналагічным» шляху, дапамагае мясцовая гаспадарка. Попыт на паслугу бывае, звычайна, падчас вясновага цыкла работ. Апрацоўка палёў не бясплатная, расцэнка вагаецца ў межах 2 рублёў за «сотку». Калгасны работнік не толькі ўзарэ зямлю, але і пабаранue, пракладзе рады. Для сваіх механізатараў прадпрыемства выдзяляе ўжо разараны ўчастак, з праведзенымі радамі, а яшчэ выпраўляе трактар, каб падвезці насенне.

Наогул, як заўважае старшыня, жыхары ўсё часцей пачынаюць браць сабе зямельныя ўчасткі. Моладзь асвойвае новыя, прыбытковыя формы заробку. Як варыянт — вырошчваюць ягады. Цяпер «лясны промысел» некаторыя руплівцы паставілі на паток, а для таго каб апрацоўваць ягаднікі, браць тэхніку ў калгасе няма патрэбы.

**Старшыня Шайтараўскага сельскага Савета дэпутатаў Верхнядзвінскага раёна Таццяна РАЗУМНАЯ** не па чутках ведае, што такое каранцінная зона. У мясцовасці аб'яўлена забарона на свініну з-за хваробы жывёлы на АЧС. Тым не менш размову старшыня пачынае з асноўнага для любой гаспадаркі — зямлі.

— Кожны год у сельсавеце праходзіць інвентарызацыя земель, перапісваем, колькі «сотак» маюць уласнікі. Бывае, што ў чалавека няма вялікай гаспадаркі, у такім выпадку дзейнічае прынцып «каб пустазеллем не зарастала»: землетрымальнікі перадаюць палі ў агульнае карыстанне. З гэтай акалічнасцю звязана яшчэ адна штогадовая работа — перасоўванне ўчасткаў. Напрыклад, жанчына звярнулася ў сельвыканкам з просьбай перадаць ёй у карыстанне зямлю недалёка ад дома, дзе ёй будзе прасцей яе апрацоўваць.

Трымаць на падвор'і свіней на тэрыторыі сельсавета нельга, таму мясцовыя сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў прадае людзям бычкоў або, наадварот, купляе ў гаспадароў рагатую жывёлу. Маладыя сем'і ўсё часцей набываюць не адну, а адразу некалькі кароў. Для такіх уласнікаў калгас нават прапануе растэрміноўку на шэсць месяцаў. Па ініцыятыве старшыні СВК Міхаіла Гумнянкова наладжаны выпас для кароў уласнікаў.

Каб гадаваць буйную жывёлу, патрэбна зерне. Кожны год сельвыканкам вядзе статыстыку па ўборачнай, старэйшыны на вёсках складаюць спіс тых, каму патрэбна дапамога тэхнікай. Па калектыўнай дамове работнікі гаспадаркі аплачваюць толькі палову затрат ад апрацоўкі зямлі тэхнікай прадпрыемства. Такі ж самы «палавінчаты тарыф» дзейнічае і для іншых жыхароў сельсавета. Можна напісаць заяву, каб калгас правеў севазварот уласнымі сіламі. За пэўную плату СВК пасее, збярэ ўраджай, пачысціць і высушыць зерне, а потым аддасць яго заказчыку.

Пра вынікі ўборачнай у мінулым часе гаворыць **Валянціна КІРЫЕНКА, старшыня Жгунскага сельскага Савета дэпутатаў Добрушскага раёна:**

— У нашай мясцовасці збожжавыя культуры сабраныя поўнасцю. Як кажуць у народзе, надвор'е і прырода паспрыялі — зерне не трэба было нават сушыць. Напэўна, таму і зваротаў у гаспадарку было нямнога, сушылка людзям аказалася непатрэбная, а прасеяць ураджай гаспадары стараюцца ўласнымі сіламі. Калі наогул гаварыць пра апрацоўку зямлі, то работа «на кані» адыходзіць у мінулае. На многіх падвор'ях цяпер стаяць мотаблокі, тыя, хто не можа сабе дазволіць падобную тэхніку, карыстаюцца прапановамі ўласнікаў. Аднавяскоўец на мабільным трактарчыку дапаможа і пасадзіць, і сабраць тое, што вырасла на полі.

Як адзначае Валянціна Кірыенка, вострых пытанняў па ўборцы сёлета не было, і адсюль робіць высноўу, што ў гаспадарцы пакуль нікому не адмовілі з дапамогай. Для пенсіянераў арганізаваны выезд камбайна і трактара, каб змалочанае зерне адразу даставіць на падворак. Асобныя грамадзяне заходзяць у сельвыканкам дазнацца, якім чынам можна купіць зерне, атрымліваюць тлумачэнні і накіраванне да старшыні калгаса.

Амаль поўнасцю за гэтыя выхадныя скончана ўборка збожжа і ў асобных сельсаветах Лідскага раёна.

— Людзі ведаюць, што спачатку ўсе сілы ідуць на ўборку масіва збожжа, і толькі калі будзе ўпарадкавана каля 75 працэнтаў ад агульных сельгасугоддзяў, камбайны заадно пачнуць выязджаць на палі вяскоўцаў. Брыгадзіры аддзяленняў СВК у рабочым парадку складаюць спісы для кіраўніцтва з імёнаў тых, хто мае зямельны ўчастак, — расказвае **Валянцін АСТРАВЕЦ, старшыня Тарноўскага сельскага Савета дэпутатаў.**

Набыць гатовае зерне у калгасе складана, непадалёк знаходзіцца зернеперапрацоўчае прадпрыемства, так што лішкаў збожжа амаль не бывае. Затое механізатары могуць атрымаць зерне як меру заахвочвання. А гаспадары-ўласнікі звяртаюцца ў калгас, калі хочуць прагнаць ураджай цераз сушылку.

Старшыня таксама згадаў восеньскую дапамогу, калі сельвыканкам садзейнічае ў выдзяленні гародніны для адзінокіх і непрацаздольных людзей. Грамадзянам бясплатна падвозяць бульбу, моркву, сталовыя буракі, капусту.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

*yurgel@zviazda.by*



# ЗРАБІЛІ — І НЕ ШКАДУЕМ!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)***

Перавага электроннай формы гандлю — адкрытасць, празрыстасць і даступнасць працэдуры, што дазваляе прыцягнуць максімальную колькасць патэнцыяльных пакупнікоў. Арганізатарам электронных таргоў можа быць як сам прадавец, так і ўпаўнаважаная арганізацыя.

— Біржа не з'яўляецца арганізатарам ці пасярэднікам, яна проста аператар, — падкрэслівае Святлана Давальцова. — Прадастаўляе электронную пляцоўку, размяшчае тое, што мы хочам, выстаўляе кошт... З аператарам у нас заключаны дагавор, паводле якога мы маем права 10 разоў у год звярнуцца да яго і выставіць колькі заўгодна зямельных участкаў. На неабмежаваную колькасць лотаў сума фіксаваная — 130 рублёў.

Мы змясцілі на сайт панарамныя здымкі ўчасткаў з прылеглымі да іх тэрыторыямі, пакет дакументаў: як тут планецца размясціць дом, гаспадарчыя пабудовы. Людзі пачалі тэлефанаваць, прыязджаць сем'ямі — бацькі, дзеці, бабулі, дзядулі. Задавалі шмат пытанняў: што такое арэнда, што такое права арэнды, чаму яго атрымліваем менавіта на 99 гадоў. З такімі дэлегацыямі даводзілася шмат працаваць, тлумачыць, паказваць, расказваць. І ўсё за кошт свайго асабістага часу, выхадных. Ды ўсе высілкі, намаганні сябе апраўдалі.

Дарэчы, у Беларусі ёсць яшчэ дзве электронныя пляцоўкі, якія прапануюць падобную паслугу і выступаюць у якасці аператараў электронных таргоў. Гэта Інстытут нерухомасці і ацэнкі і Мінскі гарадскі цэнтр нерухомасці.



Сучасныя Міханавічы.

— Пры выбары аператара мы кіраваліся перш за ўсё празрыстасцю таргоў. Мы ж прадаём зямлю — дзяржаўны патэнцыял. А гэта азначае асаблівую адказнасць, — лічыць мая суразмоўніца. — Электронныя таргі, якія выключаюць наяўнасць пасярэдніка, дазваляюць больш шырока, цывілізавана прапаноўваць зямельныя ўчасткі.

Акрамя таго, людзей прыцягвае даступнасць, зручнасць паслугі. Не трэба браць адгул на рабоце, некуды ехаць. Купіць участак чалавек можа не выходзячы з офіса ці дома ў рэжыме анлайн. Разам з тым ён спакойны, таму што не бачыць знешніх раздражняльнікаў.

— І хто ж, Святлана Уладзіміраўна, вашы патэнцыйныя пакупнікі? — цікаўлюся.

— Зразумела, што зямля — гэта ўкладанні, інвестыцыі ў будучыню. Таму не дзіўна, што ўчасткі запатрабаваны ў моладзі. Асабліва ў тых маладых людзей, якія дасягнулі пэўных поспехаў у бізнесе, прадпрымальніцтве. Яны купляюць участкі на тэрыторыі сельсавета і застаюцца задаволеныя, бо і цана прымальная, і інфраструктура нармальная.

Сярод некаторай часткі жыхароў распаўсюджана меркаванне, што зямля ў Міханавічах не так запатрабавана, як, напрыклад, у Бараўлянах або Калодзішчах, паколькі пасёлак знаходзіцца ў другім транспартным кальцы. Электронныя таргі абвергі гэту прыдумку. Магчыма, яна ўзнікла проста ад недахопу інфармацыі. Існасць чалавека ў тым, што ён імкнецца туды, пра што шмат гавораць. І не прыкмячае таго прыгожага, што побач, — цудоўнай прыроды, добрых транспартных зносін. «Думаю, дзякуючы электронным таргам, мы зможам прадаставіць максімальную інфармацыю жыхарам Міншчыны і не толькі пра наш прыгожы куток», — упэўнена Святлана Давальцова.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*lazovskaya@zviazda.by*

**Перавага электроннай формы гандлю — адкрытасць, празрыстасць і даступнасць працэдуры, што дазваляе прыцягнуць максімальную колькасць патэнцыяльных пакупнікоў. Арганізатарам электронных таргоў можа быць як упаўнаважаная арганізацыя, так і сам прадавец.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# АТАКА РЭКЛАМАЙ І НЕПАДРЫХТАВАНЫЯ ХАУС-МАЙСТРЫ

## З якімі праблемамі ў сістэме ЖКГ выбаршчыкі звяртаюцца да сваіх дэпутатаў?

**Напэўна, у кожнага набярэцца з дзясятак гісторый, звязаных з тым, як у пад'ездзе доўга не маглі замяніць лямпачку, падчас ацяпляльнага сезона даводзілася трэсціся ад холаду ці ў двары некалькі дзён ляжала непрыбраная куча смецця. Аднак аказваецца, што нараканні паступаюць не толькі з боку жыхароў, але і з боку работнікаў...**
**Пра тое, якія пытанні ўзнікаюць часцей за ўсё і як іх можна вырашыць, мы пагаварылі з дэпутатам 27-га склікання Мінскага гарадскога Савета, старшынёй Пастаяннай камісіі мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных сувязях Георгіем АТАМАНАВЫМ.**


Фота Надзеі БУЖАН.

### Цэны, смеццеправоды, сабакі...

У самым пачатку нашай размовы Георгій Пятровіч адзначыў, что сфера ЖКГ — складаная, а часта і не цалкам зразумелая. Пры гэтым яна вельмі важная для ўсіх жыхароў горада, якія хочуць бачыць побыт камфортным, а работу абслугоўваючых структур незаўважнай, недарагой і якаснай.

Такім чынам, заўсёды ў топе хвалюючых пытанняў — пастаянны рост кошту камунальных паслуг і яго абгрунтаванасць. За апошнія дзесяць гадоў толькі кошт адлічэнняў на капрамонт павялічыўся ў 4 разы; халоднага водазабеспячэння і водаадвядзення — у 18,5 раза; падагрэву халоднай вады — у 25 разоў; электраэнергіі — амаль у 17 разоў; газазабеспячэння на аднаго чалавека — у 12 разоў; вывазу і абясшкоджвання цвёрдых бытавых адыходаў — у 13,5 раза. А калі ўсё гэта падсумаваць...

Нароўні з цэнамі не пакідаюць гараджан абыякавымі і тэрміны правядзення капітальнага і бягучага рамонту жылога фонду, адмова ад цяплавой рэабілітацыі пры правядзенні капітальнага рамонту жылых будынкаў, пабудаваных больш за 30—40 гадоў таму; санітарны стан, чысціня і парадак у пад'ездах у сувязі са зменай частаты іх уборкі; утрыманне і добраўпарадкаванне прыдамавой тэрыторыі і дзіцячых пляцовак; заварванне смеццеправодаў у шматпавярховых жылых дамах, абслугоўванне запорна-перагаворных прылад, ці, працей кажучы, дамафонаў.

І калі ўсё гэта адносіцца да досыць значных пытанняў, то ёсць сярод тэм зваротаў і такія аспекты сучаснага жыцця, якія не прычыняюць асаблівай шкоды, а, хутчэй, проста раздражняюць. Напрыклад, апошнія гады мінчане просяць прыняць меры ў адносінах да распаўсюджвальнікаў рэкламнай прадукцыі, якія мала таго што запаўняюць паштовыя скрыні, дык яшчэ і расклейваюць аб'явы там, дзе ім хочацца. І калі ў гэтым пытанні рознагалоссяў няма — наўрад ці хто-небудзь з мясцовых жыхароў радуецца такім пасланням, то вакол нормаў утрымання хатніх жывёл вядуцца жорсткія спрэчкі. Адных абурае тое, што сабак выгульваюць без наморднікаў, на дзіцячых пляцоўках ці на зялёнай зоне прыдамавых тэрыторый, пры гэтым за імі не прыбіраюць і разводзяць антысанітарыю. Іншых — што з жывёлкай няма куды падацца і кожны спрабуе табе ўказваць, як абыходзіцца з уласным любімцам. Георгій Атаманаў заўважае: каб пачаць вырашаць гэтыя пытанні, неабходна больш прадметна адрэгуляваць праваадносіны ў сферах рэкламнай дзейнасці і ўтрымання хатніх жывёл на заканадаўчым узроўні або прыняццем нарматыўнага прававога акта ўрада.

### І ліфцёр, і сантэхнік, і электрык?

Наогул, па словах Георгія Атаманава, менавіта ў дзейнасць розных падраздзяленняў службаў ЖКГ прыпадае больш за палову ўсіх зваротаў. Аднак многае залежыць ад сезоннасці — «абвастрэнне» назіраецца з пачаткам ацяпляльнага перыяду.

Так, напрыклад, дэпутат дапамог пажылой пары, у кватэры якой адзначалася недастаткова высокая тэмпература — ЖЭС пытанне вырашыць не змог. Па патрабаванні дэпутата спецыялісты разам з санслужбай яшчэ раз наведалі кватэру, правялі замеры і літаральна праз некалькі дзён, дзякуючы ўзаемадзеянню з адміністрацыяй раёна, праблему ўдалося вырашыць.

А жыхары другога паверха аднаго са шматкватэрных дамоў былі пазбаўленыя магчымасці карыстацца ліфтам, таму што на іх паверсе ён папросту не спыняўся. Праўда, за даброту цывілізацыі ім нечакана пачалі выстаўляць плату. Умяшанне дэпутата дапамагло зліквідаваць гэтую несправядлівасць.

З апошняга: амаль тыдзень пасля звароту ў службу 115 не маглі памяняць у пад'ездзе лямпачку. Толькі пасля званка дэпутата ўдалося высветліць, што захварэў электрык. Але часцей зацягванне ў вырашэнні праблем звязана не з форс-мажорнымі абставінамі, а са складанай сістэмай атрымання тэндара на правядзенне тых ці іншых работ. Здавалася б, выконваць іх з-за гэтага павінны як мага больш якасна і бюджэтна, але ж пакуль дачакаешся...

— Істотных карэктыў рэформа ЖКГ у статыстыку не ўнесла — зваротаў па-ранейшаму нямала: вялікая частка гараджан дагэтуль не можа зразумець сутнасці змен. У сувязі з гэтым, думаецца, патрэбна больш дасканалая, даступная для разумення абсалютнай большасці інфармацыйна-тлумачальная работа з насельніцтвам, — разважае Георгій Атаманаў.

Самае дзіўнае, што прыстасавацца да новай сістэмы не могуць і самі работнікі ЖКГ. Многія выступаюць радыкальна: маўляў, вярніце старую. Пэўная доля логікі ў гэтым ёсць: узнікла новая пасада — хаус-майстар, а вось спецыялістаў, якія маглі б выконваць яго функцыі, няма, як і месцаў для іх падрыхтоўкі. Сантэхнік стаў хаус-майстрам, аднак працаваць з электрычнымі сеткамі ён не можа — няма неабходных уменняў і, адпаведна, допуску. Тое ж самае і з былым электрыкам у дачыненні да сантэхнічнага абсталявання, прафілактыкі і ліквідацыі праблем з вадой, цяплом, ужо не кажучы пра газазабеспячэнне або работу ліфтаў...

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*



КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## Вада спала

### Паромная пераправа «Лунінец» уводзіць абмежаванні

Гэта адбываецца з-за зніжэння ўзроўню вады ў Прыпяці. Максімальная маса аўтамабіляў, якіх бяруць на борт, не павінна быць большай за 2 тоны. Гэта абмежаванне дзейнічае да адмысловага распараджэння аб яго адмене. Да лістапада паром ходзіць па летнім раскладзе: дзесяць разоў на дзень туды-назад, пачатак руху з лунінецкага боку ў 7 гадзін раніцы, заканчэнне з столінскага — у 20:30.

Раней з-за гэтай жа прычыны змяніў свой маршрут круізны цеплаход «Жамчужыны Палесся». З красавіка ён плаваў ад Брэста да Мазыра і назад, з сярэдзіны ліпеня ходзіць толькі да шлюза Стахава Столінскага раёна. Плануецца, што да Мазыра ён даедзе ў пачатку верасня.

## Мядовы пах

### Верхнядзвінскія пчаляры паехалі абмяняцца вопытам у Латвію

Сцяпан Мілько і муж і жонка Лілія і Андрэй Бараны ўдзельнічалі ў міжнароднай канферэнцыі пчаляроў Латгальскага рэгіёна. Яна праходзіла ў латвійскім горадзе-пабраціме Верхнядзвінска — Дагда, дзе сабраліся прадстаўнікі не толькі краіны-гаспадыні, але і Літвы. На радзіме Андрэй працуе на пчальніку лягсаса, Сцяпан — у райаграсэрвісе. У Латвіі цяпер пчальнікі ў асноўным знаходзяцца ў руках прыватніка. Увогуле па гэтай прафесіі ў краіне працуюць каля 6000 чалавек. У Беларусі адпаведным хобі збольшага займаюцца пенсіянеры.

## Праз стагоддзі

### Кнігі, якія самі з'яўляюцца гісторыяй

Супрацоўнікі Веткаўскага музея старaабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава заўсёды ў пошуках рэдкіх кніг. У мясцовых жыхароў яны знаходзяць цікавыя экзэмпляры. Напрыклад, «Апостал», надрукаваны Іванам Фёдаравым у 1574 годзе ў Львоўскай друкарні. Гэта кніга перадавалася ў сям'і праз шаснаццаць пакаленняў! З вёскі Тарасаўка Веткаўскага раёна ў 1960-я былі вывезены Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года. У музеі самым раннім сярод выданняў XVI стагоддзя з'яўляецца «Евангелле вучыцельнае».

## Рыбак рыбака...

### ...пабачыць 25—26 жніўня

У гэтыя дні на возеры Воўпа Ваўкавыскага раёна пройдуць раённыя спаборніцтвы па спартыўнай лоўлі рыбы летняй паплавочнай вудаю. Да ўдзелу запрашаюцца каманды з двух чалавек, старэйшых за 18 гадоў, і прадстаўнік (ім можа быць адзін з удзельнікаў). Каманды павінны быць гатовымі для жыцця ў палявых умовах і мець неабходныя прылады.

## За акенцам машыны

### Саламяныя кампазіцыі ўпрыгожваюць палі ўздоўж аўтамабільных дарог


Фота bykhov.by

Героі мультфільмаў, жывёлы ці нават цэлыя замкі — усё гэта можна пабачыць, накіроўваючыся ў іншы горад ці вёску. Зроблены яны з саломы, якая застаецца пасля збору збожжа. На ўездзе ў аграгарадок Абідавічы Быхаўскага раёна размясціўся цягнічок. Казачны замак з трыма вежамі і яго гаспадарамі ў нацыянальных касцюмах стаіць на землях ААТ «Валадарскі». Ён ужо стаў папулярным сярод аматараў фатаграфіі. Каля дарог можна ўбачыць герояў мультфільмаў «Смяшарыкі», «Маша і Мядзведзь» і іншых.

## Праверка на чысціню

### Санітарная камісія зрабіла маніторынг мікрараёнаў у Стоўбцах

Так, у новым мікрараёне Усходні гаспадары яшчэ абжываюцца, прыводзяць у парадак дамы і тэрыторыю. Наглядальнікі адзначылі няскошаную траву, няўбраные пустазелле. На гэтым фоне акуратна выдзяляецца дзіцячы дом сямейнага тыпу з кветкамі на клумбе, дапамагаюць яе даглядаць адразу дзесяць дзяцей. Газета «Прамень» прыводзіць словы **ўрача-гігіеніста Наталлі РЫК**: «Уладальніку неабходна своечасова абкошваць зямельны ўчастак незалежна ад таго, узвёў ён дом і пражывае ў ім ці толькі пачынае будаўніцтва. За абкошванне праездаў, пустак адказваюць сельскі Савет, аб'яднанне камунальных службаў, якім таксама трэба выконваць гэтую работу без спазнення».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# СПАЖЫВЕЦ — НЕ СКАРЖНІК, А КЛІЕНТ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Міністр перакананы, што прыняцце сёлета Закона «Аб пітным водазабеспячэнні» павінна даць насельніцтву дадатковыя гарантыі ў гэтым пытанні. Ён акцэнтаваў увагу і на праблеме ачысткі сцёкавых водаў у краіне.

Летась, дарэчы, было ўведзена дзевяць новых ачышчальных збудаванняў і 127 каналізацыйных помпавых станцый, але гэтага недастаткова. 13% з дзеючых помпавых станцый зношаны на 100%. Па дамоўленасці з Сусветным банкам ЖКГ можа атрымаць каля 40 млн долараў, што дазволіць зменшыць колькасць поўнасцю зношаных ачышчальных збудаванняў.

**Ія МАЛКІНА, выконваючая абавязкі міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі,** занепакоена станам аховы водных рэсурсаў, у тым ліку ад забруджвання гарадскіх сцёкавых водаў у навакольнае асяроддзе:

— Сёння назіраецца тэндэнцыя да росту аб'ёму паступлення недастаткова ачышчаных сцёкавых водаў у паверхневыя водныя аб'екты — за апошнія тры гады ён павялічыўся ў 2,5 раза і склаў летась 8,8 млн м$^3$. У большасці выпадкаў гэта звязана або з неэфектыўнай работай камунальных ачышчальных збудаванняў, якія ўзнікаюць з-за парушэння правілаў тэхнічнай эксплуатацыі, або з іх нездавальняючым станам і недасканаласцю прынятых тэхнічных рашэнняў пры будаўніцтве. Асабліва неэфектыўна ачышчальныя збудаванні працуюць у Мсціславе, Шклове, Браславе, Рагачове, Фаніпалі, Лагойску і іншых гарадах.

На думку Іі Малкінай, такая неэфектыўная работа абумоўлена не толькі тэхнічным станам, але і непрытрымліваннем умоў прыёму прамысловых сцёкавых водаў у сістэму камунальнай каналізацыі. Яна прапанавала замацаваць у нарматыўных актах дакладны дыяпазон дапушчальных паказчыкаў шкодных рэчываў у складзе сцёкавых водаў, якія ўстанаўліваюць мясцовыя органы пры прыёме прамысловых водаў у сістэму каналізацыі. А таксама ўнесці ў склад правілаў карыстання цэнтралізаванымі сістэмамі водазабеспячэння, водаадвядзення і каналізацыі ў населеных пунктах пералік вытворчых працэсаў, пры ажыццяўленні якіх абанент абавязаны мець лакальныя ачышчальныя збудаванні. Пры гэтым дабіцца рэалізацыі гэтай нормы трэба на працягу наступных дзесяці гадоў.

Што датычыцца тарыфнай палітыкі ў галіне водазабеспячэння і водаадвядзення, то тут неабходна далейшае паэтапнае скарачэнне перакрыжаванага субсідзіравання з улікам плануемага росту рэальных даходаў насельніцтва і сістэмы адрасных датацый асобным катэгорыям, лічыць Ія Малкіна. У працэсе здабычы і падрыхтоўкі вады, улічваючы яе экалагічную і сацыяльную значнасць, важнае значэнне мае кошт гэтай вады.

Спажывец павінен купляць ваду па рэальнай рыначнай цане. Гэта дазволіць закласці асновы ўстойлівага развіцця водагаспадарчага сектара эканомікі і мець рэальны кошт вады як рэсурсу для развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

**Іван ВЕЖНАВЕЦ, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі,** акрамя таго, дадаў:

— Што датычыцца тарыфаў за ваду для насельніцтва, мы не можам устанавіць іх рознымі ў залежнасці ад месцазнаходжання, хоць затраты на яе падрыхтоўку і здабычу адрозніваюцца па краіне. Неабходна ўзбуйніць арганізацыі, якія аказваюць паслугі па водазабеспячэнні, каб фінансавыя страты адной станцыі кампенсаваліся за кошт прыбытку другой.

Для вырашэння «воднага пытання» існуе меркаванне аб неабходнасці стварэння нават асобнага дэпартамента па водазабеспячэнні і водаадвядзенні ў сістэме Мінпрыроды, заўважыў Міхаіл Мясніковіч.

## Стымул для «якаснага» смецця

У Беларусі ў пачатку 2017 года функцыянавала 168 палігонаў і 1456 мініпалігонаў у сельскай мясцовасці. Павялічваецца ахоп насельніцтва паслугай цэнтралізаванага вывазу адходаў і раздзельнага збору смецця, але гэта павінна суправаджацца больш гібкай сістэмай цэнаўтварэння.

Цяперашняя сістэма цэнаўтварэння заблытаная і мае шэраг пралазаў, дзякуючы якім можна маніпуляваць коштам. Таму Міністэрства ЖКГ падрыхтавала праект, які спросціць цэнаўтварэнне па згаданай паслузе.

Гаворачы пра рост узроўню выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў і павышэнне колькасці атрыманых з іх другасных матэрыяльных рэсурсаў, міністр ЖКГ заўважыў, што «ўжо два гады, як мы завязлі на лічбе 600 тон, і, напэўна, без увядзення новых аб'ектаў і падыходаў у сістэме наўрад ці ўдасца гэту лічбу змяніць».

Нездавальняючая сістэма кантролю за прыёмам смецця на палігонах — адна з галоўных праблем у гэтым кірунку, мяркуюць спецыялісты. Хвалюе іх таксама пытанне справядлівага кошту і тарыфікацыі ў смеццевай сферы.

Сістэма аплаты паслуг па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі не адпавядае тым затратам, што неабходны для яе арганізацыі, у тым ліку пры атрыманні другасных рэсурсаў. Плата за абыходжанне з цвёрдымі адходамі (уборка, сарціроўка, выкарыстанне, захаванне) разлічваецца па субсідзіруемых тарыфах для насельніцтва, зыходзячы з нарматыву стварэння адходаў, які зацвярджаецца выканкамамі ў залежнасці ад колькасці зарэгістраваных жыхароў.

**Аляксандр ЦЕРАХАЎ:**
— Мы меркавалі, што служба заказчыка зоймецца работай з насельніцтвам, аднак паспрабаваўшы на Мінску новую сістэму аховы правоў спажыўцоў у асобе дзяржаўнага заказчыка, мы, на жаль, не дабіліся ад яе 100-працэнтнага выканання абавязкаў, як таго патрабуе час. Служба заказчыка дагэтуль адчувае не столькі адказнасць перад насельніцтвам, колькі азадачана фінансавым здароўем выканаўцаў, падрадчыкаў, жыллёва-эксплуатацыйных арганізацый. Лічу, задача наша — стварыць эфектыўную канкурэнтаздольную сістэму кіравання ЖКГ, дзе чалавек будзе ў цэнтры паслугі, а арганізацыі, якія іх аказваюць, будуць накіраваны на задавальненне яго патрэб.

Гэта значыць, што жыхары плацяць зыходзячы не з фактычнай колькасці адходаў, а з нормаў смецценакаплення на чалавека, выказалася Ія Малкіна:

— Па сутнасці, атрымліваецца ланцужок: чым больш ЖКГ вывезла і захавала смецця, тым больш будзе мець датацый з бюджэту. Гэта не спрые зацікаўленасці ў здабыванні другасных рэсурсаў з адходаў, і грамадзяне таксама не вельмі імкнуцца да раздзельнага збору смецця. Каб стымуляваць іх да гэтага, неабходны дыферэнцыяваны памер тарыфаў на камунальныя паслугі па зборы і вывазе смецця ў залежнасці ад ступені здабывання з яго другасных рэсурсаў і небяспечных адходаў і самога складу камунальных адходаў.

Аператар другасных рэсурсаў выплачвае юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам кампенсацыю за збор на тэрыторыі Беларусі адходаў упакоўкі і шкляной тары. Памер кампенсацыі ўстаноўлены для канкрэтнага найменнявання тавару без уліку механізма збору другасных рэсурсаў. Але ж адна справа, калі яны адразу сабраныя паасобку, а іншая — калі іх прывезлі ў складзе іншых адходаў на сартаравальную станцыю і здабываюць уручную.

— Наспела неабходнасць унясення змен у інструкцыю аб парадку выплаты кампенсацыі юрыдычным асобам і ІП расходаў па зборы на тэрыторыі краіны адходаў тавараў і адходаў упакоўкі, шматабаротнай шкляной упакоўкі, якая зацвярджаецца Мінжылкамгасам, — заўважыла Ія Малкіна.

**Ія МАЛКІНА:**
— Прынцып «забруджвальнік плаціць» на практыцы стаў неэфектыўным. Неабходны пераход на ўплату экалагічнага падатку ў залежнасці ад масы скідвання забруджвальных рэчываў у складзе сцёкавых водаў. Павінна быць распрацавана стратэгія кіравання воднымі рэсурсамі ва ўмовах клімату, які змяняецца, на перыяд да 2030 года.

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:**
— Тэма ЖКГ вельмі няпростая і комплексная. Бытуе меркаванне, што ЖКГ — гэта толькі тарыфы, аднак нельга скаціцца да разгляду пытання выключна па прынцыпе «больш-менш». Тарыфы — гэта выніковы паказчык, які фарміруецца комплексам эканамічных, навуковых, тэхнічных, арганізацыйна-кадравых, нарматыўна-прававых умоў, і ўсё гэта трэба ўлічваць. Прысутным кіраўнікам пры падрыхтоўцы матэрыялаў да нарады з удзелам Прэзідэнта, што адбудзецца ў верасні, трэба абавязкова ўлічваць гэты комплексны падыход.

## Эканомія цяпла і захаванне жылля

Выпрацоўка цеплаэнергіі — не толькі самая затратная паслуга для прадпрыемстваў ЖКГ, але і самая важкая графа для спажыўца пры аплаце «камуналкі». З гэтай нагоды пошук шляхоў зніжэння яе сабекошту — прыярытэтная задача ўсіх камунальных ведамстваў.

А сабекошт цеплаэнергіі па-ранейшаму застаецца даволі высокі. Гэта адбываецца праз эксплуатацыю неэфектыўнага кацельнага абсталявання, выкарыстанне ручной працы, вялікую працягласць цепласетак.

1,5 тысячы кацельных, якія засталіся без змен, цягнуць гаспадарку ўніз. На перавод іх на мясцовыя віды паліва патрэбна каля 300 млн рублёў, аднак гэта разумны ўклад сродкаў, і тэрмін акупнасці ў цэлым па ўсіх мерапрыемствах складзе не больш за пяць гадоў.

Увага ўдзяляецца і прымяненню сучасных інавацыйных тэхналогій. Асвоена ўласная вытворчасць цеплавых утылізатараў дымавых газаў кандэнсацыйнага тыпу, эфектыўнасць якіх пацверджана паказчыкамі, дасягнутымі ў працэсе эксплуатацыі на кацельнай у Віцебску. У выніку расход паліва на вытворчасць цеплаэнергіі ўдалося паменшыць, а ККД катла павялічыць амаль на 8%, сабекошт цеплаэнергіі знізіўся на 10 рублёў. На думку міністра ЖКГ, такімі ўтылізатарамі павінны быць абсталяваны ўсе новыя і мадэрнізуемыя кацельныя.

Сёння Мінжылкамгас распрацоўвае праект, які павінен стымуляваць грамадзян да эканомнага расходу цеплавой энергіі. Прадугледжаны таксама шэраг мерапрыемстваў, якія дазволяць знізіць расходы. Гэта ліквідацыя неэфектыўных цеплакрыніц, пераход на мясцовыя віды паліва, выкарыстанне фрэзернага торфу (на ім атрымліваецца самая танная энергія). Выконваецца і дэцэнтралізацыя сістэм цеплазабеспячэння, калі неэфектыўныя жылыя дамы адключаюць ад цеплатрас і пераводзяць іх на самастойнае цеплазабеспячэнне. Уласнікі такім чынам атрымліваюць выгаду, бо могуць пачынаць і заканчваць ацяпляльны сезон па ўласным жаданні.

Камунальнікам, дарэчы, удалося захаваць жыллёвы фонд краіны і не дапусціць павелічэння састарэлага і аварыйнага жылля. Колькасць такога складае менш за 0,1% ад плошчы ўсіх эксплуатуемых дамоў. Аварыйнага жылля ў краіне крыху больш за 65 тысяч м$^2$, а састарэлага — 178 тыс. м$^2$. Па тэхнічным абслугоўванні сёння распрацаваны тэхналагічныя карты, якія датычацца індывідуальна кожнага жылога дома, вызначаны і распрацаваны пералік відаў работ, якія арганізацыя абавязкова павінна выконваць. Сачыць за выкананнем павінна служба заказчыка. У яе задачы ўваходзіць ахова правоў спажыўца і садзейнічанне стварэнню сучаснага ўважлівага падыходу да кожнага.

— Час мяняць стэрэатыпы, што спажывец — гэта прасіцель, скаржнік ці проста плацельшчык. Насамрэч гэта кліент, якому патрабуюцца паважлівыя адносіны і ўвага. Рашэнні павінны быць скіраваны на забеспячэнне яго правоў і патрэбнасцяў, — заўважыў Аляксандр Цэрахаў. І падкрэсліў, што прыярытэтнай задачай галіны ЖКГ застаецца работа па зніжэнні затрат і вызначэнні аптымальнага, справядлівага кошту, дзе будзе захаваны баланс цаны без страты якасці.

**Ірына СІДАРОК.**
sidarok@zviazda.by

КАМПЕТЭНТНА



# КАБ НЕ ВЫСАХЛА ЖЫВАТВОРНАЯ КРЫНІЦА

## Чаму ў Беларусі такія актуальныя праблемы воднай гаспадаркі?

**Здавалася б, на першы погляд, праблемы забеспячэння вадой жыхароў нашай краіны як такой няма. Яшчэ са школьных гадоў мы дакладна ведаем, што Беларусь — «краіна блакітных азёр», і прыроднага запасу вады нам хопіць на доўгія дзесяцігоддзі. Аднак спецыялісты б'юць трывогу: 25 працэнтаў проб вады з грамадскіх калодзежаў сёння не адпавядаюць санітарным патрабаванням з-за павышанага ўтрымання нітратаў. Сітуацыя з цэнтралізаваным водазабеспячэннем таксама далёкая ад ідэалу: больш за 18 працэнтаў проб водаправоднай вады былі непрыдатныя да ўжывання з-за павышанага ўтрымання ў ёй жалеза.**

Паводле інфармацыі санітарна-эпідэміялагічных службаў, сёння ў краіне патрэба ў станцыях абезжалезвання складае амаль 60 працэнтаў. Пры гэтым яна максімальная ў Гомельскай вобласці — 86,9 працэнта. Такія звесткі былі агучаны на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі.

Дарэчы, для забеспячэння ўсіх жыхароў беларускіх аграгарадкоў цэнтралізаваным водазабеспячэннем неабходна пабудаваць 2 300 км водаправодных сетак і 570 артэзіянскіх свідравін. Для таго каб гэта ажыццявіць, трэба каля 220—250 мільёнаў долараў. Сума прыстойная. Зразумела, што мясцовым уладам такая задача не пад сілу. Вырашаць яе, на думку спецыялістаў, неабходна ў маштабах краіны з прыцягненнем сродкаў інвестараў.

Зрэшты, забеспячэнне якаснай пітной вадой — усяго адна з болевых кропак водазабеспячэння, якія, што называецца, сёння на паверхні. **Доктар тэхнічных навук, прафесар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Анатоль ГУРЫНОВІЧ** працуе над праблемамі воднай гаспадаркі нашай краіны ўжо не адзін дзясятак гадоў. На думку вучонага, сёння прыйшоў час комплексна падыходзіць да сітуацыі, якая склалася ў сістэме водазабеспячэння насельніцтва, вырашаючы праблемы галіны з розных бакоў. Напрыклад, большасць водазаборных свідравін (а іх сёння ў розных рэгіёнах краіны за 30 тысяч) знаходзіцца ў нездавальняючым стане, і больш за трацін — не працуе.

Навукоўцы налічваюць некалькі сотняў крыніц забруджвання падземных і паверхневых водаў. Ільвіную долю тут займаюць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. З палёў і ферм у рэкі сцякаюць рэшткі хімічных рэчываў, якія ўжываюцца для барацьбы з пустазеллем і шкоднікамі, пестыцыды, а таксама арганічныя і неарганічныя ўгнаенні, якія змяшчаюць азот, фосфар, калій і іншыя хімічныя элементы.

Вялікую трывогу ў эколагаў выклікаюць і скіды з прамысловых прадпрыемстваў. Больш за ўсё пакутуюць ад гэтага рэкі, размешчаныя побач з буйнымі населенымі пунктамі. Напрыклад, такія, як Свіслач на ўчастку, які праходзіць ніжэй Мінска, Уза побач з Гомелем, а таксама рэкі Уша ніжэй горада Маладзечна, Днепр, Бярэзіна ніжэй горада Барысава, Прыпяць, Ясельда, Заходні Буг каля Брэста, рака Мухавец у раёне горада Кобрына. Паводле звестак Міністэрства прыродных рэсурсаў і ахоўы навакольнага асяроддзя Беларусі, у мінулым годзе ў краіне было скінута ў навакольнае асяроддзе каля васьмі мільёнаў тон сцёкавых водаў.

Знос сетак і інжынерных збудаванняў сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення ў сярэднім па краіне на гэты момант перавышае 60 працэнтаў.

неабходных мер па ліквідацыі недахопаў прывядзе да яшчэ большага зніжэння якасці пітной вады і паслуг каналізацыі, пагаршэння эканамічнага і фінансавага стану спецыялізаваных арганізацый.

Сёння ўсе аб'екты і прадпрыемствы сістэмы водазабеспячэння насельніцтва знаходзяцца ў распараджэнні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пасля ліквідацыі Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР у нас адсутнічае дзяржаўны орган кіравання гэтай галіной, што прывяло да становішча, калі ў краіне няма адзінай і зладжанай палітыкі далейшага развіцця сістэмы воднай гаспадаркі рэспублікі. Напрыклад, няма тэхнічных рэгламентаў бяспекі вады, адсутнічаюць метадалогіі маніторынгу і ацэнкі запасаў падземных водаў на тэрыторыі Беларусі. Практычна ніхто не можа дакладна сказаць, як у далейшым варта выкарыстоўваць глеістыя пляцоўкі, а гэта, між іншым, дзевяць мільёнаў тон патэнцыйных угнаенняў. А як абясшкодзіць атрутныя асадкі сцёкавых вод? Гэта яшчэ адно з многіх нявырашаных пытанняў.

Асобная праблема — беражлівыя адносіны да водных багаццяў Беларусі, бо гэта стратэгічны і жыццёва важны для жыхароў нашай краіны рэсурс. І ён не бязмежны. На словах гэта разумеюць усе. А на справе

задач неабходна стварыць цэнтралізаваны дзяржаўны орган, магчыма нават адрадзіць дэпартамент па меліярацыі і воднай гаспадарцы.

Беларусь з 2009 года далучылася да «Пратакола па праблемах вады і здароўя», у якім было вызначана, што ахова здароўя чалавека павінна ажыццяўляцца шляхам паляпшэння кіравання воднымі рэсурсамі, аховы экасістэм і прадухілення, кантролю і зніжэння звязаных з вадой захворванняў. Былі распрацаваны «Аналітычны даклад аб стане воднай гаспадаркі» і «Водная стратэгія Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года». Аднак, паводле слоў спецыялістаў, усе гэтыя дакументы пакуль не атрымалі ніякага далейшага прасоўвання. І на практыцы амаль нічога не робіцца, каб гэта выправіць.

Па ініцыятыве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу цяпер ідзе дапрацоўка папраўак у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб пітным водазабеспячэнні», які быў прыняты яшчэ ў 1999 годзе і патрабаваў карэкціроўкі з улікам патрабаванняў часу і сітуацыі, якая склалася ў воднай гаспадарцы краіны. Спецыялісты спадзяюцца, што новае заканадаўства дазволіць вырашыць найбольш вострыя праблемы, якія наспелі ў сістэме забеспячэння насельніцтва пітной вадой. Аднак цалкам відавочна, што сітуацыя патрабуе больш комплекснага і



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Да таго ж нізкі ўзровень іх тэхнічнага абслугоўвання, а таксама недахоп фінансавых сродкаў на мадэрнізацыю вядуць да вялікіх страт вады — да 30 працэнтаў, у той час як сярэдні паказчык па краінах Еўрасаюза вагаецца ў межах 10 працэнтаў.

Паводле слоў спецыялістаў, цяпер склалася сітуацыя, пры якой далейшае зацягванне з прыняццем

складваецца сітуацыя, якая мяжуе з безгаспадарчасцю. Ні для кога не сакрэт, што большасць прамысловых прадпрыемстваў выкарыстоўваюць пітную ваду для тэхнічных патрэб і не зацікаўленыя ўкараняць водазберагальныя тэхналогіі вытворчасці.

Многія спецыялісты сыходзяцца ў меркаванні, што для вырашэння ўсіх гэтых

сістэмнага падыходу ў частцы размеркавання сферы ўплыву і адказнасці паміж мясцовымі органамі ўлады і зацікаўленымі ведамствамі — у першую чаргу ў мэтах стварэння эфектыўнай водагаспадарчай палітыкі, якая павінна быць накіравана на дасягненне ўстойлівага развіцця эканомікі Беларусі.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

МЕРКАВАННІ

# ШТО Б ВЫ ЗМЯНІЛІ Ў РАБОЦЕ СІСТЭМЫ ЖКГ?

**Такое пытанне мы задалі людзям, якія маюць прамое і апасродкаванае дачыненне да гэтай сферы.**

**Старшыня Крупскага раённага Савета дэпутатаў Дзмітрый КЛІМЯНКОЎ:**

— У мяне адзінае пажаданне: каб нармальна ставіліся да выканання сваіх абавязкаў усе работнікі гэтай структуры. У іх усё ёсць: грошы ёсць, вытворчыя магутнасці ёсць. Я мяркую па сваёй ЖКГ: павінен быць нейкі зладжаны калектыў, а ўсе неабходныя ўмовы ўжо створаны. Як гэтага дасягнуць? Зладжанасць — не аднаго дня справа. Неабходна рыхтаваць якасныя кадры, якія, дарэчы, павінны быць мясцовымі, каб яны хацелі жыць і працаваць у гэтым месцы. Толькі пры выкананні такой умовы ў нас будзе нармальная работа. Як вы ведаеце, у сферу дзейнасці ЖКГ патрапілі могілкі, дарогі і іншыя аб'екты — я лічу, што гэта якраз тое, чым камунальнікі павінны займацца. За гэта яны атрымліваюць грошы. У цяперашняй эканамічнай сітуацыі трэба браць на сябе як мага больш аб'ёмаў, бо гэта зарплата супрацоўнікаў. Усе хочуць шмат грошай, але пры гэтым думаюць, як перакласці абавязкі на кагосьці іншага. Так быць не павінна.

**Начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Дубровенскага раённага выканаўчага камітэта Тамара САПЕГІНА:**

— Я хацела б, каб заканадаўства ў гэтай галіне было больш пастаянным, а то толькі навучымся працаваць па адных законах, як ужо з'яўляюцца новыя. Не вельмі добра, што абсалютна ўсё «скінулі» на жыллёва-камунальныя гаспадаркі. І могілкі, і дарогі, і водазабеспячэнне — за гэта адказвае ЖКГ. Неабходна падзяліць зоны ўплыву: няхай дарожнікі займаюцца дарогамі, энергетыкі займаюцца святлом — і гэтак далей. Засмучае, што людзі не бачаць плюсоў, якія ёсць у сістэме ЖКГ. Напрыклад, у нас хутка «Дажынкі», рамантуем многія дамы. Але і тут ёсць нюанс: вызначылі кошт квадратнага метра па капітальным рамонце, вышэй за які нічога рабіць нельга. А калі ў доме трэба і дах памяняць, і вокны, а яшчэ патынкаваць?

**Дырэктар Ашмянскага раённага ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей БЕЛЯНКОЎ:**

— Самае важнае — гэта перадаць камбінатам бытавога абслугоўвання лазні і гасцінічныя гаспадаркі, у тым ліку — і сельскія могілкі, інакш кажучы, забраць ад нас усе няпрофільныя аб'екты. Гэта асабіста маё меркаванне, а таксама меркаванне многіх іншых кіраўнікоў службы. Для таго каб нам нармальна працаваць, атрымліваць прыбытак і ўкладваць яго ў развіццё, у мадэрнізацыю нашага абсталявання, нам неабходны абаротныя сродкі. Вышэйназваныя аб'екты адносяцца да катэгорыі сацыяльных, таму яны прыносяць не прыбытак, а страты. Гэтыя страты ЖКГ пакрывае за кошт свайго прыбытку, тым самым сыходзяць абаротныя сродкі. А мы ж яшчэ плацім за ваду, электрычнасць, плацім зарплаты. Мы павінны ўкладваць грошы ў мадэрнізацыю кацельняў, цепласетак, помпавых станцый — рабіць тое, чым мы і павінны займацца. А мы займаемся сацыяльнымі пытаннямі.

**Блогер, грамадскі актывіст, вэб-распрацоўшчык, спажывец паслуг ЖКГ Дзмітрый ВАЛАТКО:**

— Калі выбіраць адну рэч, самую важную, то для мяне галоўным была б наяўнасць дакладнай, зразумелай і прагназуемай зваротнай сувязі ад ЖКГ. Каб гэта не была нейкая скрыначка, у якую бабуля з суседняга пад'езда нешта адправіла, і ўсё гэта ў выніку страцілася. Гэта значыць, каб чалавек напісаў, і яму адказалі. Напрыклад: адрамантуйце асфальт. І адказ: паважаны, ну няма цяпер на гэта грошай, мы запланавалі асфальтаванне на пэўную дату, па выкананні мы абавязкова напішам. Зараз, калі браць той жа самы партал 115.бел, то пачак маіх заўваг «вісіць» там на кантролі ўжо не першы месяц. І я не атрымліваю ніякай зваротнай сувязі. Яшчэ адзін прыклад: нядаўна хадзіў у ЖЭС, каб адрамантавалі плітку каля дома. Запісалі мой тэлефон, дырэктар паабяцаў, што патэлефануе і раскажа, колькі гэта будзе каштаваць, — і ўсё, знік. Калі няма зваротнай сувязі, то і няма даверу да ЖКГ.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

ШТО НА МЕСЦАХ?

# ПАКУЛЬ БОЛЬШ ПЫТАННЯЎ...



## Карэспандэнт «МС» высвятляла, як працуе ў Магілёве і Бабруйску служба заказчыка

**Стварэнне службы заказчыка стала адным з крокаў у бок удасканалення жыллёва-камунальнай сферы. У Мінску яна дзейнічае ўжо некалькі гадоў, а летась з'явілася ў Магілёве і Бабруйску. Але, як сведчаць спецыялісты, некаторыя складанасці перашкаджаюць ёй працаваць на абласным узроўні ў поўную моц. Якія?**

Функцыі заказчыкаў узялі на сябе магілёўскае гарадское ўпраўленне камунальных прадпрыемстваў (УКП) і бабруйскі жылкамгас. Усе астатнія камунальныя прадпрыемствы — «Гарводаканал», «Гарсвятло», жыллёва-эксплуатацыйныя ўпраўленні і гэтак далей (прычым як дзяржаўныя, так і прыватныя) — перайшлі ў разрад падрадчыкаў, або іншымі словамі — выканаўцаў. У ідэале служба заказчыка павінна служыць непасрэдна інтарэсам жыхароў. Напрыклад, у нейкім доме наспела неабходнасць нешта адрамантаваць або ўдасканаліць. І не трэба шукаць, да каго звярнуцца. Дастаткова патэлефанаваць у службу заказчыка. Яна на тэндарнай аснове выбера выканаўцу і нават пракантралюе працэс. Калі падрадчык схалтурыў, прыйдзецца ўсё перарабляць, прычым ужо за свой кошт. Вывад: жыхар задаволены, што зэканоміў, і, галоўнае, атрымаў якасную паслугу. Ну а падрадчыкі будуць больш сумленна ставіцца да сваіх абавязкаў, каб іх не «з'елі» канкурэнты. Нармальныя рыначныя адносіны.

Спецыялісты наракаюць, што ёсць некалькі прычын, якія замінаюць паўнавартасна функцыянаваць службе. «Па законе служба заказчыка абавязана заключыць дагаворы з кожным спажыўцом жыллёва-камунальных паслуг на кожную камунальную паслугу, акрамя цепла-, газа-, электра- і водазабеспячэння, і кантраляваць выкананне, — кажуць у магілёўскім УКП. — Для кантролю прыйдзецца стварыць дадатковую службу, якая будзе весці тэхнагляд. А грошай на гэта няма. Інструкцыяй №13 Міністэрства ЖКГ прадугледжана фінансаванне дзяржзаказчыка, але на гэтыя грошы разлічваць нельга, паколькі служба заказчыка створана рашэннем Магілёўскага гарвыканкама. А ва Указе агаворваецца, што гэта можа зрабіць толькі Мінскі гарвыканкам або аблвыканкамы».

Мінскі гарвыканкам і аблвыканкамы — паняцці розныя. Прадпрыемстваў, куды ўваходзяць усе камунальныя службы, што абслугоўваюць горад, у аблвыканкамаў няма. Камунальная маёмасць знаходзіцца выключна ў гарадской і раённай уласнасці. На якой падставе аблвыканкаму заключыць дагавор са спажыўцамі паслуг, калі абслугоўваннем жылога фонду ён не займаецца наогул? Прыходзіцца прыстасоўвацца да гэтай ролі гарадскім прадпрыемствам.

— Сёння вельмі складана прыраўняцца да Мінска такому гораду, як наш. Крыху іншае фінансаванне, не зусім зразумела, за кошт чаго гэтую службу ўтрымліваць, — кажа **генеральны дырэктар «Бабруйскжылкамгаса» Алена АСАДЧАЯ.** — Прадпрыемствам не хапае сродкаў на свае справы, хоць мы ўвесь час толькі тым і займаемся, што зніжаем затраты. Але механізма паступлення сродкаў для службы заказчыка няма. Мы засталіся ў тым жа складзе, што і былі, а нагрузка павялічылася. Для кантролю павінны існаваць людзі, якія будуць сачыць за якасцю гэтых работ, своечасовым іх выкананнем.

Пакуль служба заказчыка працуе ў абмежаваных праграмай «Камфортнае жыллё» рамках. Па-новаму вядзецца работа, звязаная з капрамонтам, бягучым рамонтам і добраўпарадкаваннем. Але нават у такім урэзаным выглядзе перавагі ёсць. Знізілася колькасць скаргаў, паменшыліся затраты.

**Начальнік аддзела па арганізацыі работы па заяўным прынцыпе «адно акно», работы са зваротамі грамадзян, юрыдычнай і кадравай работы ўпраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама Генадзь ЛЕБЕДЗЕЎ** адзначае, што зроблена вельмі шмат па павышэнні камунальнай адукаванасці людзей.

— Калі ў нарматыўна-прававых дакументах выразна прапісалі, як правільна запаўняюцца паведамленні аб аплаце, некаторыя пытанні зняліся самі сабой, — сведчыць ён. — Цяпер у квітанцыі ўказваюцца менавіта тыя затраты, што нясуць арганізацыі. Сёлета за шэсць месяцаў на прадпрыемствы ЖКГ паступіла 654 звароты, звязаныя з аплатай жыллёва-камунальных паслуг, у той час як летась за такі ж перыяд — 769. Наогул сёлета за паўгода паступіла 3700 зваротаў. Летась іх было 4291.

— Што датычыцца службы заказчыка, то, каб яна паўнавартасна функцыянавала, на ўзроўні ўрада павінны быць прынятыя дакументы, якія выразна акрэсляць яе паўнамоцтвы і функцыі, — кажа Генадзь Лебедзеў. — Неабходна на заканадаўчым узроўні вызначыць і крыніцу фінансавання, абавязкі, задачы. У нарматыўных дакументах яны пакуль дакладна не прапісаны. Ва Указе №563 гаворыцца, што такая работа можа праводзіцца, але не тлумачыцца, як.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# КРОК ДА АПТЫМІЗАЦЫІ

## Як працуе падраздзяленне ЖКГ у самым заходнім горадзе краіны

**Высокае некалі было раённым цэнтрам. Адгалоскі таго становішча захаваліся да гэтай пары. Так, філіял «Высокаўскі» Камянецкай ЖКГ абслугоўвае фактычна паўраёна — як тут кажуць, усю «высокаўскую зону».**

Сёння названы філіял уяўляе сабой шматгаліновае прадпрыемства з аб'ектамі ў Высокім, вёсках Абароўшчыне, Расне, Макараве, Воўчыне, Пагранічнай. Калектыў у паўтары сотні чалавек абслугоўвае кацельныя і водазаборы, жыллёвы фонд, падтрымлівае стан дзясяткаў кіламетраў дарог, займаецца добраўпарадкаваннем населеных пунктаў, а таксама гарадскога сквера, палацава-паркавага ансамбля Патоцкіх і іншых аб'ектаў.

Усе кірункі работы камунальнікаў важныя для жыцця людзей. Але добраўпарадкаванне — тое, што заўсёды навідавоку, што перыядычна выклікае як удзячнасць, так і нараканні. **Майстар участка добраўпарадкавання Вольга ШАМЕЦЬКА** паказвае сваю гаспадарку. У цэнтральным гарадскім скверы шмат кветак. Сквер нядаўна атрымаў літаральна новае аблічча. Закладзены адразу пасля вайны, ён даўно ўжо «прасіў» перамен. І вось правялі рэканструкцыю, якая абышлася ў шэсць мільярдаў недэнамінаваных рублёў. Амаль усе дрэвы захавалі, але з'явіліся новыя дарожкі, абсталяваная дзіцячая пляцоўка. А кавалі-прадпрымальнікі падарылі гораду эксклюзіўныя лаўкі з каваным аздабленнем — цяпер асабліва прыемна пасядзець у цяньку. Сквер стаў прыгожы, што і казаць. Чысціню і парадак тут штодня падтрымлівае дворнік Алена Торхава. Яе мы і засталі за работай — Алена Іосіфаўна прыбірала апалае лісце, якое нагадвала пра хуткую восень.

Вольга Шамецька расказала, што зараз на ўчастку ў яе занятыя шэсць дворнікаў і два рабочых па азеляненні. Аднаго з іх мы засталі за скошваннем травы вакол агароджы галоўнай славутасці Высокага — палацава-паркавага ансамбля. «У парку, вядома, варта было б мець асобнага рабочага, — разважае майстар па добраўпарадкаванні. — Але пакуль такой адзінкі ў штаце няма. А пасля кожнага са шматлікіх мерапрыемстваў, якія праводзіць горад на тэрыторыі старадаўняга парку, раніцай наступнага дня на ўборку выходзім усім цэхам».



Дом па вуліцы Савецкай пасля капрамонту.

Яшчэ адну вялікую работу нядаўна закончылі па добраўпарадкаванні могілак. Усяго на балансе Высокаўскага філіяла ЖКГ значыцца дзевяць могілак раёна. У Высокім іх двое, так званыя старыя і новыя. Дык вось на старых могілках даўняй праблемай сталі дрэвы. Некаторыя з іх знаходзіліся ў аварыйным стане, здаралася, падалі, разбівалі помнікі. За апошнія два гады тут было прыбрана больш за 150 дрэў. Грошы на паслугі прамысловых альпіністаў сабралі гараджане. Спецыялісты зрэзалі дрэвы. Усё астатняе рабілі камунальнікі, маецца на ўвазе, збіралі і вывозілі драўніну з тэрыторыі, прыбіралі галіны і смецце. Цяпер могілкі выглядаюць акуратнымі і дагледжанымі.

> Добраўпарадкаванне — тое, што заўсёды навідавоку, што перыядычна выклікае як удзячнасць, так і нараканні.

— Добраўпарадкаванне — гэта штодзённая малапрыкметная работа, — разважае Вольга Шамецька. — Але любыя недапрацоўкі альбо хібы людзі прыкмячаюць адразу. Таму скаргі альбо нараканні для нас не рэдкасць. Стараемся правільна рэагаваць і выпраўляць памылкі. Хацелася б, каб і грамадзяне праяўлялі пэўную свядомасць. На шчасце, такіх большасць... Але здараецца, пасадзіш кветкі ў рэканструяваным скверы, а іх украдуць. У парку аднойчы новыя сметніцы ўкралі. Праўда, міліцыя знайшла злодзея, пазней ён кампенсаваў страты. Добра было б, каб пра парадак навокал хоць крышачку клапаціліся ўсе, — агучвае пажаданне-мару майстар участка.

Тым больш, што апошнім часам у Высокім зроблена вельмі многа для паляпшэння якасці жыцця. **Старшыня Высокаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай САЧЫК** расказаў, што раней ва ўсходняй частцы горада наогул не было каналізацыі. І вось праект па пракладцы адпаведных сетак фактычна завершаны. Яго ажыццяўленне стала магчымым дзякуючы гранту — большая частка фінансавання ішла па лініі тэхнічнай дапамогі Еўрасаюза.

